Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выдання—XV
№ 335 (4741)
Пятніца, 18 сьнежня 1931 г.

МЕНСК, Савецкая 63

Сёньня ў нумары

АРТЫКУЛЫ. ПЕРАДАВАЯ — Рыхтавацца да трэцяй бальшавіцкай вясны (1-я стар.). Р. З. — Мацней агонь па зброяносцах Троцкага (2-я стар.). В. Т. — Яўрэйская буржуазія дзякуе... (2-я стар.).

ДСЕСЯЦІГОДОВЫ ЮБІЛЕЙ ПАЭТА АЛЕКСАНДРОВІЧА — ПЕРАМОГА БЕЛАРУСКАЙ ПРАЛЕТАРСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ (3-я стар.).

АДКРЫЛАСЯ 2-я СЭСІЯ ЦВК БССР (1-я стар.).

Да канца вытруціць кулацка-спажывецкія тэндэнцыі (1-я стар.).

Множце вопыт пераможцаў (1-я стар.).

З бальшавіцкай непрымірымасьцю змагацца супроць апартуністычных спроб сказіць ленінскую лінію партыі ў нацпытаньні (2-я стар.).

Сталоўка заводу «Чырвоны мэталіст» стала ўзорным цэхам харчаваньня (3-я стар.).

Вопыт саўгасу «Лудчыца» ва ўсе сьвінасаўгасы БССР (4-я стар.).

КІТАЙ. — Імпэрыялісты разрываюць Кітай на часткі. (4-я стар.).

ПОЛЬШЧА. — Усеагульная забастоўка рабочых тутунёвай прамысловасьці.

Рыхтавацца да трэцяй бальшавіцкай вясны

На 10-га сьнежня 50,3% бядняцка-серадняцкіх гаспадарак аб'ядналіся ў калгасы, перайшлі ад індывідуальнай да калектыўнай формы працы.

Гэтыя посьпехі дасягнуты ў выніку правільнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі.

Ня гледзячы на маладосьць асноўнай масы калгасаў, у 1931 годзе з посьпехам праведзена веснавая сяўба і ўборачная кампанія. План сяўбы па калгасах выкананы на 101,1 проц., а па тэхкультурах, што асабліва важна,—на 105 проц.

Значныя зрухі ёсьць і ў галіне жывёлагадоўлі. Арганізавана 1064 МТКФ агульным стадам у 126.209 штук буйной рагатай жывёлы, 1600 СТКФ па стадам у 71.000 сьвіноматак, 889 фэрм па гадоўлі цялят і г. д.

Гэта паказвае на тыя вялізарныя магчымасьці, якія ствараюцца ад адзнаго толькі аб'яднаньня у арцелі, ад калектыўнага скарыстаньня сродкаў вытворчасьці. Унутраныя магчымасьці яшчэ больш павялічваюцца, калі ўлічыць, што на палёх БССР у часе веснавой і асеньняй сяўбы працавала 30 МТС.

Калгасы і саўгасы зьяўляюцца асноўнымі вытворцамі с.-г. прадукцыі. БССР становіцца адным з асноўных жывёлагадоўча-ільняных раёнаў Савецкага Саюзу.

ЦК УсеКП(б) у сваёй пастанове ад 2-га жніўня і лістападаўскі аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б з усёй рашучасьцю паставілі перад кожнай партарганізацыяй задачу барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, як цэнтральную ў калгасным будаўніцтве на даным этапе.

Мы павінны дабівацца ня толькі колькаснага павялічэньня, але і **якаснага** паляпшэньня пасеўнай плошчы. З меншай плошчы, пры найменшай затраце сіл атрымаць як можна больш добраякаснай с.-г. прадукцыі — у гэтым галоўнае ў рабоце кожнага калгасу і саўгасу.

Пасьпяховае скончэньне ў 1932 г. пяцігодкі за чатыры гады ў значнай ступені будзе залежаць ад посьпехаў трэцяй бальшавіцкай вясны. Вось чаму веснавая пасеўная кампанія мае выключнае гаспадарча-палітычнае значэньне. Выкананьне колькасных і асабліва якасных пляновых заданьняў—баявая праграма дзеяньняў у рабоце ўсіх партыйна-савецкіх, прафэсыянальных і камсамольскіх арганізацый.

Яравы клін у 1932 г. пашыраецца да 2.850 тыс. гэкт. супроць 2.672 тыс. гэкт. у 1931 г. Пасеў тэхнічных культур павялічваецца: пад ільном з 240 тыс. гэкт. да 320 тыс. гэкт., канопляні — з 40 тыс. гэкт. да 50 тыс. гэкт. і г. д.

Калі ў мінулым годзе па калгасных палёх працавала 30 МТС, дык у 1932 годзе колькасьць МТС будзе даведзена да 52. Трактарны парк у пераводзе на 10-сіляныя трактары, павялічыцца да 10.000 штук, будзе завезена с.-г. машын на 10 млн. руб.

Вялізарныя ўкладаньні дзяржавы ў сельскую гаспадарку ствараюць неабходныя ўмовы для яшчэ большага росту вытворчых сіл вёскі, што таксама забясьпечвае больш пасьпяховае правядзеньне пасеўнай кампаніі.

Аднак, правядзеньне трэцяй бальшавіцкай вясны, поўнае выкананьне намечаных пасеўных плянаў будзе залежаць ад таго, наколькі кожная партарганізацыя скарыстае зімовы час для правядзеньня ўсіх мерапрыемстваў па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў — усядзеньня сапраўднай зьдзэльнічыны, паладжаньня ўліку, выпрацоўкі адпаведных норм, падрыхтоўкі масавых кадраў, ліквідацыі абязьлічкі і ўраўнілаўкі і г. д.

Поўная рэалізацыя пасьці ўмоў тав. Сталіна ў кожным калгасе, саўгасе, МТС — важнейшая задача ў падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі.

Каб забясьпечыць належную сустрэчу вясны, неабходна зараз-жа пачаць падрыхтоўку.

У першую чаргу ўсе раённыя арганізацыі павінны дабіцца таго, каб вызначаныя ўрадам пляны былі шырока папулярызаваны сярод усёй масы калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас аднаасобнікаў. Змагацца за тое, каб кожны саўгас і калгас вышаў у поле падрыхтаваным.

Па прыкладзе мінулага году трэба чакаць, што і сёлета апартуністычныя элемэнты будуць імкнуцца даказаць перэальнасьць плянаў, будуць імкнуцца правесьці зьмяншэньне пасеву тэхнічных за лік павялічэньня спажывецкіх культур. Усім гэтым спробам сарваць спэцыялізацыю, якая забясьпечвае рост тавернасьці буйной сацыялістычнай гаспадаркі, павінен быць дан руйнуючы адпор. Масы калгасьнікаў і аднаасобнікаў павінны быць мабілізаваны на поўнае выкананьне і перавыкананьне плянаў пасеўнай за лік асваеньня новых земляў, раскарчовак і г. д.

Ва ўсёй сыстэме падрыхтоўчай работы пізавыя арганізацыі павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу на стварэньне **насенных фондаў**. Трэба памятаць, што пасеўная плошча яравога кліну павінна быць цалкам забясьпечана насеньнем саміх калгасаў і саўгасаў. Усякае спадзяваньне на завоз насеньня і бязьдзейнасьць у стварэньні насенных фондаў павінны разглядацца, як спроба зрыву пасеўнай кампаніі. Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на забясьпячэньне насеньнем поза-арганізаваных калгасаў. Усякія спробы разбазарыць, або скарміць насенныя фонды павінны разглядацца, як кулацкія ўчынкі.

Шпаркі рост жывёлагадоўчых гаспадарак выклікае неабходнасьць стварэньня моцнай **кармовай** базы. Выкананьне гэтай задачы немагчыма без стварэньня моцнай насеннаводчай базы кармовых траў, недахват якіх у мінулым тармазіў пашырэньне пасеўных плошчаў. У сувязі з гэтым асаблівае значэньне набывае пашырэньне плошчаў пад насевамі кармовых і культурных траў. У 1932 годзе павінна быць закладзена магутная насеннаводчая база, якая-б цалкам забясьпечыла насеньнем асабліва кармовых траў наступныя гады.

Пытаньне барацьбы за **ўраджайнасьць і даходнасьць** трэба паставіць у цэнтр увагі ў часе падрыхтоўчай работы. Для выкананьня гэтай задачы павінны быць скарыстаны ўсе вагары і сродкі. Абмен мясцовага насеньня па чыстагатунковае, збожжачыстка, распрацоўка плянаў па тарфаваньні і вапнаваньні глебы, устанаўленьне правільных севазваротаў, якія-б забясьпечвалі навышэйшае ўраджайнасьці ўсіх культур і асабліва асноўнай культуры ў адпаведнасьці з ухілам гаспадаркі. Вакол усіх гэтых пытаньняў трэба мабілізаваць шырокія масы калгасьнікаў і рабочых саўгасаў.

Завоз трактараў, складаных с.-г. машын і інвэнтару ні ў якім разе не павінен аслабіць увагу да машын, што ёсьць у гаспадарцы. **Наадварот, усе наяўныя машыны і інвэнтар за зімовы час павінны быць прыведзены ў працаздольны стан.** Пачатая рамонтная кампанія павінна праходзіць пад знакам свячасовага і дабраякаснага рамонту, пры самым шырокім разгортваньні сацпаборніцтва па рамонтных пунктах, у калгасах і саўгасах. Дабіцца мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, эканомнага расходваньня частак да машын і матар'ялаў і, такім чынам, забясьпечыць належны рамонт і захаваньне машын у поўнай гатоўнасьці да вясны. Калгасы і саўгасы павінны праявіць максымум ініцыятывы і энэргіі для таго, каб дробны рамонт машын правесьці мясцовымі сіламі і рэсурсамі.

Завоз трактараў ні ў якім разе не павінен аслабіць увагі да каня. Конская цягавая сіла вясной будзе адыгрываць рашаючую ролю ў скарачэньні і свячасовым правядзеньні сяўбы. Між тым, мы наглядаем факты агіднага ігнараваньня конскай цягавай сілы.

Факты злачынных адносін да конскай цягавай сілы павінны быць неадкладна і ў корані зжыты. Трэба зараз-жа забясьпечыць нармальную зімоўку для коняй, максымальна выкарыстаць унутраныя рэсурсы для стварэньня фуражных фондаў.

Правільная арганізацыя працы ў пэрыяд уборачнай кампаніі дала выключна дадатныя вынікі. Правёўшы разьмеркаваньне ўраджаю і даходаў выключна па колькасьці і якасьці працы, кожная партарганізацыя павінна дабіцца ільназагатоўкі і ня выконваюць цьвёрдых заданьняў. Па цьвёрдых заданьнях спагнана каля 20 проц. Між тым, тэрмін здачы ільну ўжо даўно прайшоў.

Парт'ячэйка і сельсавет ня кіруюць ільназагатоўкамі і не мабілізуюць калгасьнікаў і бяднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў на выкананьне іх абавязкаў перад дзяржавай.

Ц. Райкоўскі.

АДКРЫЛАСЯ II СЭСІЯ ЦВК БССР

Прамова т. Чарвякова

Ва ўступнай прамове, тав. Чарвякоў, адкрываючы сэсію, сказаў:

— Другая сэсія ЦВК БССР пачынае сваю работу ў апошнія дні трэцяга рашаючага году пяцігодкі, калі рабочая кляса, калгасьнікі, усе працоўныя Савецкай Беларусі разам з працоўнымі Савецкага Саюзу, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі і ленінскага ЦК, вядуць барацьбу за пасьпяховае завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі.

Мінулы год быў годам напружанай барацьбы на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва. Ленінскае пытаньне «хто каго» вырашана на карысьць сацыялізму. Значна ўзрасла роля прамысловасьці ў народнай гаспадарцы Савецкай Беларусі. Калі яшчэ ў мінулым годзе валавая прадукцыя прамысловасьці складала меншую частку ўсёй валавой прадукцыі народнай гаспадаркі БССР, дык у гэтым годзе яна складае звыш 50 проц. усёй валавой прадукцыі народнай гаспадаркі. На аснове посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва паляпшаецца дабрабыт рабочай клясы.

Усіх гэтых посьпехаў краіна Саветаў дабілася, дзякуючы пасьпяховаму ажыцьцяўленьню шасьці паказаньняў тав. Сталіна. Адначасова трэба адзначыць, што тыя недахопы і прарывы, якія ёсьць на паасобных прадпрыемствах, зьяўляюцца ў асноўным вынікам апартуністычнай недаацэнкі паказаньняў тав. Сталіна, няўменьнем перабудаваць сваю работу ў адпаведнасьці з новымі задачамі.

Посьпехі індустрыялізацыі краіны, рашучае наступленьне сацыялізму на ўсім фронце на капіталістычныя элемэнты ўнутры краіны далі магчымасьць дабіцца буйных посьпехаў у справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. На 1-га лістапада г. г. 50 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР ужо ўваходзіла ў калгасы. Мы з посьпехам вырашаем задачу пашырэньня тэхнічных культур, вядзем барацьбу за вырашэньне жывёлагадоўчай праблемы.

Арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў—цэнтральная задача, па выкананьне якой партыя і ўрад мабілізуе ўсю пралетарскую грамадзкасьць, аснова для далейшага разгортваньня калгаснага руху і ліквідацыі кулацтва як класы, на базе суцэльнай калектывізацыі. Недаацэнка гэтай важнейшай задачы зьяўляецца праяўленьнем апартунізму на практыцы і вымагае з нашага боку самай рашучай барацьбы.

Посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва даюць магчымасьць урэду разгортваць усё большыя тэмпы сацыялістычна-культурнага будаўніцтва — па ўсеагульным навучаньні, ліквідацыі няпісьменнасьці і г. д.

Наша работа адбываецца ва ўмовах надзвычай абвостранай класавай барацьбы. Гэта вымагае ад нас самых шільных адносін да кожнага праяўленьня клясавай барацьбы, да канкрэтных посьбітаў буржуазных варожых тэндэнцый, якія заносяцца ў напы савецкія ўстановы. Супроць правага апартунізму, — галоўнай небясьпекі на даным этапе, — мы накіравалі асноўны агонь у сваёй барацьбе. Праяўленьні «левых» загібаў, якія выявіліся на радзе вучасткаў нашай работы, льлюць ваду на млын правага апартунізму, яны таксама вымагаюць ад нас самай жорсткай клясавай пільнасьці. Барацьба супроць прымірэнчых адносін да праяўленьняў апартунізму — важнейшая задача ўсіх нашых пралетарскіх арганізацый.

Прэзыдыум сэсіі.

Тыя посьпехі, якія мы маем у справе сацыялістычнага будаўніцтва, зьяўляюцца вынікам рашучага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі і рашучай барацьбы супроць ухілаў ад яе ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму, як найбольш небясьпечнага, супроць шавінізмаў усіх іншых колераў.

Ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі і барацьба супроць шавінізмаў спрыяла яшчэ большаму замацаваньню інтэрнацыянальнай сувязі працоўных усіх нацыянальнасьцей для барацьбы за вырашэньне ўсіх задач сацыялістычнага будаўніцтва, спрыяла яшчэ большаму замацаваньню сувязі Савецкай Беларусі з Савецкім Саюзам, яшчэ большаму замацаваньню СССР.

У той час, калі Савецкая Беларусь разам і пры дапамозе Савецкага Саюзу вядзе пераможную барацьбу за сацыялізм, капіталістычны сьвет перажывае паласу надзвычай глыбокага эканамічнага і палітычнага крызісу. Мы для пасьпяховага разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва імкнемся да таго, каб захаваць мір. Капіталістычныя-ж краіны наадварот, шукаючы выхаду з эканамічнага і палітычнага крызісу, пад прыкрыцьцём усякага роду пацыфісцкіх дэманстрацый, узмоцнена рыхтуюцца да ўзброенага нападу на СССР.

У апошнія дні мы маем зусім нядвусэнсавыя заявы з боку асобных прадстаўнікоў буржуазнай палітычнай думкі аб тым, што падзеі на Далёкім Усходзе адкрываюць жаданыя пэрспэктывы да выхаду з эканамічнага і палітычнага крызісу ў выглядзе новай вайны, якая можа ажывіць прамысловасьць, гандаль, крэдытны зварот і можа на пекаторы час адтэрміновать канчатковы крах капіталістычнага ладу.

Тая перастаноўка сіл паміж капіталістычнымі дзяржавамі, якая ў сучасны момант адбываецца ў сувязі з падзеямі на Далёкім Усходзе, зьяўляецца нічым іншым, як імкненьнем стварыць спрыяючыя ўмовы для нападу на Савецкі Саюз, для інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу.

Вось чаму, вядучы мірнае будаўніцтва і ня спыняючы барацьбы за захаваньне міру, мы ў той-жа час павінны зварачаць увагу на падзеі ў міжнародных адносінах, не забываючы ні на хвіліну аб необходнасьці павялічэньня абароназдольнасьці нашай краіны, аб узмацненьні баяздольнасьці нашай Чырвонай арміі.

У сувязі з II сэсіяй Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту асобныя прадпрыемствы заканчваюць свае вытворчыя праграмы, асобныя саўгасы і калгасы заканчваюць пляны загатовак. Аднаасобнікі — беднякі і серадняки таксама з посьпехам выконваюць свае абавязкі.

Гэты ўздым у сувязі са скліканьнем II сэсіі ЦВК зьяўляецца адбіткам таго агульнага энтузіязму і ўздыму, тэй творчай ініцыятывы, якая наглядалася на працягу ўсяго гэтага часу ў выкананьні задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Мы ўпэўнены ў тым, што II сэсіі ЦВК СССР мы зможам далажыць, што ў Савецкай Беларусі задачы 3-га рашаючага году пасьпяхова вырашаюцца, што Савецкая Беларусь падрыхтавана для таго, каб уступіць у новы чацьверты, заключны год пяцігодкі.

Дзеньнік сэсіі

* Пасьля прамовы тав. Чарвякова сэсія адразу-ж прыступае да дзелавой работы. Прымаецца наступны парадак дня: даклад ураду аб кантрольных лічбах народнай гаспадаркі на 1932 г. **(тав. Галадзед)** і суадклад Дзяржпляну **(тав. Шапіра)**; фінансавы плян і бюджэт на 1932 год **(тав. Хацкевіч)** і суадклад бюджэтнай камісіі **(тав. Калнін)**; даклад аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў **(тав. Міцьноў)**.

* На першым-жа пасяджэньні 16-га сьнежня быў заслухан даклад **тав. Галадзеда** аб кантрольных лічбах народнай гаспадаркі на 1932 год.

* На раніцнім пасяджэньні 17-га сьнежня суадклад па пытаньнях народна-гаспадарчага пляну на 1932 год зрабіў старшыня Дзяржпляну тав. **Шапіра.**

* Учора адбываліся спрэчкі на дакладу тав. Галадзеда і суадкладу тав. Шапіра.

* У падарунак сэсіі Магілеўскі лесапрамгас выканаў узятыя на сябе абавязкі па адгрузцы 5.000 раўмэтраў дроў і 5.082 раўмэтраў будаўнічага дрэва.

* Менскае аддзяленьне Дзяржбанку рапартуе сэсіі, што на 17-га сьнежня ім выканан датэрмінова плян мабілізацыі сродкаў у 4-м квартале. Дадатковая падпіска па пазыку 3-га рашаючага складае 435.000 рублёў.

* Сіроцінскі РВК і РК КП(б)Б рапартуе сэсіі, што плян мабілізацыі сродкаў у 4-м квартале раёнам выкананы датэрмінова на 101 проц., а гадавы плян — на 100,7 проц. (2.017 тыс. рублёў). Заданьне па збожжазагатоўках выкананае на 100,4 проц., па мясазагатоўках — на 120 проц., па сенажазагатоўках — на 102,3 проц.

* У файэ клюбу харчавікоў арганізавана вялікая выстаўка, якая ў экспанатах, фатаграфіях і дыяграмах малюе дасягненьні сацыялістычнага будаўніцтва БССР.

* Учора каля 6 гадз. увечары адбылося урачыстае адкрыцьцё помніка У. І. Леніну ля будынку клюбу харчавікоў.

„Ні аднаго цэнтнэра збожжа—прыватніку" (ЦК УсеКП(б)

ДА КАНЦА ВЫТРУЦІЦЬ КУЛАЦКА-СПАЖЫВЕЦКІЯ ТЭНДЭНЦЫІ

Ход збожжазагатовак па БССР (на 15-га сьнежня).

У проц. да агульнага пляну

СЭКТАР	Проц. выкананьня гадовага пляну.
1. Калгасы	80,1
2. Аднаасобны сэктар	62,6
3. Саўгассыстэмы .	75,1
4. Памольны збор .	41,3
Усяго па БССР	69,2

Зламаць кулацкае супраціўленьне

Кулак Быньковы закапаў звыш 5 тон збожжа

ВОРША. Кулак Быньковы з вёскі Зубры, Рудкоўскага сельсавету, атрымаў цьвёрдае заданьне па здачы збожжа. Увесь час ён ухіляўся ад выкананьня заданьня і падаваў заяву за заявай аб яго вызваленьні, паколькі ў яго «нічога няма».

Каб праверыць становішча кулака, сельсавет паслаў да яго брыгаду. У часе праверкі гаспадаркі Быньковы, выкрыта больш 5 тон збожжа, захаванага ў зямлі, 80 клг. ільну, некалькі дзесяткаў кілёграм сала і розныя прамтавары. Апрача таго, Быньковы захаваў каля 8 цэнт. збожжа ў свайго цесьця.

Калі брыгада праводзіла праверку, жонка Быньковы накінулася з сякерай на аднаго з брыгадзіраў, але прысутныя папярэдзілі забойства.

Адпаведным органам трэба заняцца гэтай справай і прыцягнуць кулака Быньковы за сабатаж збожжазагатовак да суровай адказнасьці.

У.

Старшыня калгасу імя Валадарскага Пэлерман—праваднік кулацкага ўплыву

ШКЛОЎ. (Наш кар.).

Дзякуючы ўдарнай рабоце большасьці калгасаў Шклоўшчыны, сацыялістычны сэктар раёну дабіўся ПЕРАВЫКАНАНЬНЯ плянаў здачы збожжа на 66 проц. Славенскі сельсавет здаў каля 360 проц. заданьня, Александроўскі — 348 проц., Лазецкі — 329 проц. Пералічаныя калгасы па-баявому мабілізавалі масы на выкананьне сваіх абавязкаў перад пралетарскай дзяржавай У ПЕРШУЮ ЧАРГУ.

Аднак, дагэтуль ёсьць яшчэ рад калгасаў, дзе ня зжыты рвацка-месьніцкія тэндэнцыі, дзе ігнаруюцца заданьні па здачы збожжа. Калгасы Еганаўскага сельсавету выканалі плян на 23,5 проц., Уланаўскага — на 43,6 проц., Каменка-Лаўскага — на 39,6 проц. Калгасы імя Леніна і Валадарскага дагэтуль не здалі ні аднаго кілё. Старшыня калгасу імя Валадарскага ПЭЛЕРМАН тлумачыць дрэнную здачу збожжа тым, што «мы намалацілі на пасеў і для сваіх уласных патрэб, а вось будзе час, намалоцім і для дзяржавы, калі будуць лішкі». Гэтыя разважаньні з гапавой выдаюць апартуніста — агента кулацтва.

Адстае аднаасобны сэктар вёскі. Аднаасобнікі здалі 63,4 проц. Прырост за апошнюю пяціднёўку складае толькі 0,3 проц. Гэта тлумачыцца яўнай недаацэнкай аднаасобнага сэктару, слабасьцю масавай работы. У радзе сельсаветаў значна аслаб націск на кулацка-заможныя гаспадаркі. Падгайцаўскі сельсавет спагнаў толькі 24 проц. цьвёрдых заданьняў, Захоцкі—34 проц.

Шклоўскі РК КП(б)Б павінен дабіцца рашучага зруху ў здачы збожжа па раёне, шляхам бязьлітаснага ўдару па праваапартуністычных і «лявацкіх» скажэньнях лініі партыі ў збожжазагатоўках.

„Пачакаем, можа зусім зьнімуць"

ГЛУСК. (Наш спэц. кар.). Саўгас «Завалочыцы» ў свой час атрымаў заданьне — здаць 700 цэнт. збожжа. Праз некалькі тыдняў плян здачы зьменшан да 300. Зараз дазволена саўгасу здаць толькі 180 тон.

Такое скаканьне лічбаў толькі дэзарыентуе саўгасныя арганізацыі. Дырэктар саўгасу т. **Холад** проста заяўляе: «Пачакаем, можа, зусім зьнімуць».

У выніку тэмпы здачы збожжа зусім павольныя. Да 11-га сьнежня саўгас здаў толькі 80 цэнт.; кожны дзень адгружаецца ня больш 20. Такім чынам патрэбна больш 5 дзён, каб выканаць плян у 100 цэнт. Між тым пры ўдарнай рабоце гэта збожжа можна здаць за адзін дзень. Незразумелым зьяўляецца той факт, што раённыя арганізацыі нічога ня ведаюць аб заданьнях, даных саўгасу.

М.

Не здалі ні аднаго цэнтнэра

РАГАЧОЎ. Саўгасы раёну замест таго, каб ісьці ў першых радох збожжазагатовак, гапебна адстаюць. Кіраўніцтвы саўгасаў «Забалоцьце», «Турск» і «Красьніца» ўпарта ігнаруюць дырэктывы аб першачарговай здачы збожжа дзяржаве. Яны яшчэ не здалі ні аднаго цэнтнэра. Парт'ячэйкі гэтых саўгасаў страцілі клясавую чуласьць і сталі на апартуністычны шлях разважаньняў аб «перэальнасьці» плянаў. На агульных сходах пытаньне аб збожжазагатоўках ні разу ня ставілася. У пасьценгазэтах на працягу месяца ня зьмешчана ні адна заметка наконт здачы збожжа. Вінаватыя ў затрыманьні збожжа павінны быць прыцягнуты да адказнасьці. Трэба ўзяць прыклад з саўгасаў «Дзеллава» і «Ціханічы», якія поўнасьцю выканалі пляны загатовак.

Сотні тон разбазаранага памольнага збору

Зусім дрэнна стаіць справа са спагнаньнем памольнага збору па Дрысенскім, Полацкім і Асьвейскім раёнах. Многія млыны ня бачылі кантралёраў цэлымі гадамі. У выніку шматлікія факты разбазараньня памольнага збору.

Калгас «Надзея», Дрысенскага раёну, за 8 месяцаў прысвоіў 18 тон збору; камуна «Сталіна» разбазарыла 7 тон; калгас «Чырвоны сьцяг», Сірдзіцкага сельсавету, прысвоіў 11 цэнт. збожжа, камуна «Маяк», Сарвейскага сельсавету, забрала сабе 2 тоны пшаніцы. Апрача таго рэвізійная камісія камуны сьпісала больш 5 цэнт. збожжа, якога не хапала ў загадчыка млыну, у якасьці «нармальнай утрускі».

Полацкая кантора Саюзхлеба дала тэрміновае заданьне кантралёрам выявіць, колькі памольнага збору забралі калгасы і камуны, і скласьці пратаколы; але акты спакойна ляжаць сталоў РВК. Трэба тых, хто разбазарвае памольны збор, прыцягнуць да крымінальнай адказнасьці паводле пастановы ўраду БССР.

Шах.

* * *

Загадык Зуброўскага млыну, Аршанскага раёну, **Курнасенка** разбазарвае памольны збор. Мукой і жытам ён плаціць за нагрузку збожжа, за розныя работы па млыне, а таксама раздае прадукцыю сваім знаёмым. Рабочыя станцыі Зубры і леспрамгасу апрача таго, што яны забясьпечваюцца ў плянавым парадку, атрымліваюць па млыне жыта і пшаніцу.

Курнасенка за разбазараньне памольнага збору павінен быць зьняты з работы і аддан пад суд.

Менская база не наладзіла прыёмкі валакна

ПЛЕШЧАНІЦЫ. (Па тэлефону).

На 10-га сьнежня Плешчаніцкі раён выканаў гадавы плян ільназагатовак на 51,4 проц. Знаходзіцца ў сельспажыўтаварыстве і ня здачы яшчэ на базы 13 тон. Калі ўлічыць гэту колькасьць ільнавалакна, дык процант здачы ўзьнімецца да 62 проц.

Уперадзе — Забішчанскі сельсавет, які выканаў плян на 102 проц., Брусаўскі сельсавет—на 71 проц.

Райком партыі і РВК мабілізавалі на ільназагатоўкі ўвесь партыйны і савецкі актыў раёну. **Райком ЛКСМ** арганізаваў ільняную эстафэту. У калгасы і вёскі выехалі 15 камсамольцаў.

Райза вылучыў прэміяльны фонд у 500 руб. для прэміяваньня лепшых ударнікаў ільнянога фронту.

Менская ільнабаза не наладзіла прыёмкі ільну. Возчыкам прыходзіцца чакаць прыёмшчыкаў па 12 гадзін. Працаўнікі базы часта ня цікавяцца якасьцю ільну, прымаюць нават бракаваную прадукцыю, што зьяўляецца грубым парушэньнем дырэктыў аб прыёмцы.

Брыгада «Зьвязды»: СІМКОЎСКІ, ГЕЛЬПМАН, ГОЛЬДМАН і ЦЭЙТЛІН.

МНОЖЦЕ ВОПЫТ ПЕРАМОЖЦАЎ

УЗЯЦЬ НА ГРАМАДЗКІ БУКСІР КАЛГАСЫ, ЯКІЯ АДСТАЮЦЬ У АПРАЦОЎЦЫ І ЗДАЧЫ ІЛЬНУ

Перэдавікі ільназагатовак

Калгас «ШЛЯХ ДА САЦЫЯЛІЗМУ», Рудкаўскага сельсавету, першы ў Аршанскім раёне выканаў свае абавязкі перад дзяржавай па здачы (продажу) ільнавалакна. Замест 56 цнт. здана 56,38 цнт. Перавыканан таксама плян здачы ільнасемя.

Калгас «СНОП», Збарскага сельсавету, Асіпавіцкага раёну, датэрмінова выканаў плян апрацоўкі і здачы дзяржаве ільнавалакна.

Калгас «Сноп» у парадку сацыялістычнага буксіру аказвае практычную дапамогу ў першапачатковай апрацоўцы ільну суседнаму калгасу «Шлях волі».

Па Полацкім раёне да 10 сьнежня скончылі апрацоўку і здачу ільнавалакна дзяржаве 17 калгасаў. Сярод іх калгасы «Шлях Сталіна», «Чырвоны маяк», «Новы сьвет», «Ленінскі прамень», імя Фрунзэ, «Чырвоны партызан», «Герой працы», «Савецкая Беларусь», «Будзёнавец», «Баявік» і інш.

Калгас «КАМСАМОЛЕЦ», Любаньскага раёну, па-ўдарнаму правёў апрацоўку і здачу ільну. Былі створаны ўдарныя брыгады, якія працавалі амаль круглыя суткі. Ільнамялкі прыводзіліся ў рух конным прывадом ад малатарні. Недалёка ад сушні быў абсталяваны стары будынак, у якім праводзілася трапаньне ільну. Лепшыя калгасьніцы-ўдарніцы прэміяваліся. Калгас «Камсамолец» выклікаў на сацпаборніцтва ўсе астатнія калгасы Любаньскага раёну.

Па цьвёрдых заданьнях спагнана толькі 20 проц.

ДУБРОЎНА.

Па Расткоўскім сельсавеце, Дубровенскага раёну, плян ільназагатовак выкананы усяго на 7 проц. У некаторых калгасах да гэтага часу ня вылучаны брыгады мяльшчыкаў, трагальшчыкаў і сушыльшчыкаў, ня складзены рабочыя пляны апрацоўкі ільну. Ільнамялкі не нагружаны. Вельмі слаба ўкараняецца зьязельшчына.

Па аднаасобным сэктары лён амаль поўнасьцю апрацаван, але на загатоўчыя пункты паступае вельмі слаба.

Кулацка-заможныя гаспадаркі сабатуюць ільназагатоўкі і ня выконваюць цьвёрдых заданьняў. Па цьвёрдых заданьнях спагнана каля 20 проц. Між тым, тэрмін здачы ільну ўжо даўно прайшоў.

Парт'ячэйка і сельсавет ня кіруюць ільназагатоўкамі і не мабілізуюць калгасьнікаў і бяднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў на выкананьне іх абавязкаў перад дзяржавай.

Ц. Райкоўскі.

Капыльская МТС—у баку ад загатовак ільну

КАПЫЛЬ.

Капыльскі раён правальвае ільназагатоўкі. На 10 сьнежня, замест 70 проц., здана каля 10 проц. ільнавалакна.

Асабліва слаба праходзяць ільназагатоўкі па аднаасобным сэктары, які выканаў плян на 5,9 проц.

Да гэтага часу не разгарнула работы капыльская МТС. Калгасы, якія абслугоўваюцца МТС, здалі 14,9 проц. у той час, як астатнія калгасы выканалі плян на 36,4 проц.

Райспажыўсаюз не наладзіў уліку паступленьня ільнавалакна. Прэміяваньне лепшых здатчыкаў пастаўлена вельмі дрэнна. Трэба дабіцца пералому ў ходзе ільназагатовак.

А.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

З БАЛЬШАВІЦКАЙ НЕПРЫМІРЫМАСЬЦЮ ЗМАГАЦЦА

супроць апартуністычных спроб сказіць ленінскую лінію партыі ў нацпытаньні, супроць гнілога лібэралізму да супраціўленцаў беларусізацыі

Больш пільнасьці

Кіраўніцтва-перавыбарчая кампанія кіруючых органаў КП(б)Б уступіла ў палавіну рэспіных партканфэрэнцый. Адным з важнейшых задач у рабоце партканфэрэнцый павінна быць падгуляльнае практычная работы мясцовых парторганізацый па ажыцьцяўленьні ленінскай нацпалітыкі, як сустаўной, пекарнуўнай часткі сацыялістычнага будаўніцтва.

Высьвятленьне і няўхільнае ажыцьцяўленьне ленінскія прынцыпы ў нацпытаньні, КП(б)Б забясьпечыла вялізарнейшыя дасягненьні ва ўсіх галінах гаспадарчага і культурнага будаўніцтва БССР. Набытыя посьпехі будаўніцтва пракладаюць дарогу на зьмесьце і нацыянальнай па форме культуры ёсьць проста результат бальшавіцкай барацьбы КП(б)Б супроць ухілаў да вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе і ўхілаў да мясцовага нацыяналізму. КП(б)Б разгромила беларускі нацыянал-дэмакратызм, шырока выкрыўшы перад працоўнымі мясамі Савецкай Беларусі яго кінжальны варожы і контр-рэвалюцыйную сутнасьць, як агентуры польскага фашызму, як рэстаўратара капіталізму.

Адным, мясьцовае перамаганьне клясава-варожых супраціўленьняў на шляху ажыцьцяўленьня нацпалітыкі не ў найменшай меры не павінна аслабляць барацьбы на гэтым фронце. Наадваротнае клясавая барацьба ў краіне прадпісвецца з усёй яе абвостранасьцю, і клясавы вораг у супраціўленьні цярпіцьму сацыялістычнаму наступленьню дзеля шырока ўжывае новыя формы і метады варожай дзейнасьці, патрэбна павышэньне бальшавіцкай пільнасьці і непрымірымасьці ў кожнай партарганізацыі, у кожнай пасобкай партячэйцы да апартуністычных спробаў сказіць ленінскую лінію партыі ў нацпытаньні.

Лист тав. Сталіна ў рэдакцыю часопісі «Пролетарская революция» з усёй бальшавіцкай рашучасьцю ставіць перад усёй партыяй задачу павышэньня клясавай пільнасьці, бязьлітаснай барацьбы з «трацкісцкай кантрабандай» і «гнілым лібэралізмам» у адносінах да ўсякіх спроб рэвізаваць тэорыю бальшавізму. Гэты бальшавіцкі дакумант найвялікшай палітычнай важнасьці павінен зьявіцца праграмай баявых дзеньняў кожнай партарганізацыі і па ажыцьцяўленьні нацпалітыкі.

Ухіл у бок вялікадзяржаўнага шавінізму, які «прабуе рэвізаваць асновы ленінскай нацпалітыкі і які пад сьцягам інтэрна ізаціялізму прыкрывае імкненьні аджываючых клясаў панаваўшай раней вялікарасійскай нацыі зьвярнуць сабе страчаныя прывілеі» ўяўляе сабой галоўную небясьпеку на даным этапе.

Сканцэнтроўваючы галоўны ўдар па ўхіле ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму, рашуча выкрываючы спробы адмаўляць нацыянальную форму пралетарскай культуры, трэба таксама бязьлітасна вытручаць усякія рэцыдывы нацдэмакратызму, выкрываць ухіл у бок беларускага шавінізму.

Задачы больш поўнага далучэньня да актыўнага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве працоўных нацменшасьцяй патрабуюць паладжваньня сыстэматычнай работы па інтэрнацыянальным выхаваньні, неаслабнай барацьбы з праяўленьнямі шавінізмаў розных колераў. Неабходна такая барацьба вакол кожнага канкрэтнага факту, каб яна была сапраўды выхаваўчы характар мае, а ня проста фармальнае «рэагаваньне».

Сёньня мы зьмяшчаем адозву рабкораў абутковай фабрыкі да ўсіх рэдкалегій, шматтыражак і штодзённых газэт фабрык і заводаў. Сама ініцыятыва і вызначаныя мерапрыемствы рабкораў абутковай заслугоўваюць вялікай увагі. Мясцовыя партарганізацыі павінны забясьпечыць водгук нізавога друку на гэту адезву канкрэтнай справай, узмацненьнем сыстэматычнай работы па мабілізацыі мас на ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі.

Мэтадамі „даручыць і далажыць" справы не палепшыш

Кіраўніцка-перавыбарчая кампанія партарганізацый у Капыльскім раёне паказала, што ў значнай частцы партыйных ячэек і сельпарткомаў мала можа пахваляцца работы па ажыцьцяўленьні ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Месячнік пусьнені беларусізацыі не зрабіў належнага пералому ў гэтай справе. Бюро РК два разы ставіла на сваім пасяджэньні пытаньне аб праведзеньні месячніка, але ні разу яно не абмяркоўвалася.

Толькі тады, калі месячнік кончыўся і было ясна, што ён правален, бюро РК вынесла пастанову—«даручыць нацкамісіі і агітмасаваму аддзелу ў пяцідзённы тэрмін скончыць працу» па правядзеньні месячніка і аб выніках паведаміць бюро. Гэта пастанова лішні раз падкрэсьлівае, што капыльскі РК КП(б)Б фармальна адносіцца да правядзеньня месячніка беларусізацыі, недаацэньвае важнейшага участку сваёй работы.

За апошні час у раёне выяўлен рад вылазак вялікадзяржаўных шавіністаў, актывізацыя ўхілістаў у бок буржуўнага шавінізму і антысэміцкіх вылазак. (Берт, Федасеў і інш.). Кожная партячэйка павінна павысіць бальшавіцкую пільнасьць у змаганьні за ажыцьцяўленьне нацпалітыкі, узмацненьне работы па інтэрнацыянальным выхаваньні.

П.

Парт'ячэйка літфакультэту выпраўляе сваю памылку

Пасьля зьмяшчэньня ў «Зьвязьдзе» допісу **«Клясава-варожая вылазка ня сустрэла адпору»**, бюро парт'ячэйкі **літфакультэту ВПІ** ўзялося за выпраўленьне сваёй палітычнай памылкі.

Гэта памылка заключалася ў нерэагаваньні на клясава-варожыя выступленьні студэнткі **Бітэр.**

У прынятай пастанове на гэтым пытаньні бюро ячэйкі адзначае, што зьмешчаны ў «Зьвязьдзе» допіс зусім правільна завастрае пытаньне на ідэалёгічна-арганізацыйнай вылазцы студэнткі Бітэр і па несваячасовым рэагаваньні на гэта з боку парт'ячэйкі літфакультэту.

Бюро ячэйкі падкрэсьлівае, што выступленьне Бітэр, якое зводзілася да ідэалізацыі контр-рэвалюцыйнай меншавіцкай арганізацыі і Бунду—ёсьць **клясава-варожая контр-рэвалюцыйная вылазка,** якая зьяўляецца адлюстраваньнем мінулай дзейнасьці Бітэр у бундаўскай арганізацыі. Кіраўніцтва парт'ячэйкі лічыць сваёй **грубейшай палітычнай памылкай** позьняе рэагаваньне на контр-рэвалюцыйную вылазку Бітэр.

Курсавы сход аднадушна асудзіў клясава-варожую вылазку студэнткі Бітэр.

Побач з гэтым, ячэйкай вызначаны канкрэтныя мерапрыемствы па мабілізацыі мас студэнтаў на рашучую барацьбу за чыстату марксыцка-ленінскай мэтадалёгіі, супроць усялякіх праяўленьняў апартунізму, супроць вялікадзяржаўнага ўхілу — галоўнай небясьпекі, контр-рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму і шавінізмаў іншых колераў.

Вызначаныя мерапрыемствы павінны быць неадкладна праведзены ў жыцьцё.

Н.

Фармальны падыход да важнейшай задачы

Парт'ячэйка Беларускай краявой канторы **Саюзтрансу** зусім слаба змагаецца за практычнае ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі. У апараце канторы не праводзіцца работа па інтэрнацыянальным выхаваньні.

Нядаўна мела месца антысэміцкая вылазка супрацоўніка канторы **Клюпс.** Мясцком фармальна падышоў да рэагаваньня на гэта варожае праяўленьне. Праўда, Клюпсу абвешчана вымова, але-ж належнай выразнай ацэнкі гэтаму факту дана ня было, не мабілізаваны ў належнай меры масы па ўзмацненьне барацьбы супроць праяўленьняў шавінізму розных колераў.

Беларусізацыя ў апараце праводзіцца фармальна. Аб ёй толькі былі гутаркі ў часе правядзеньня месячніка, а потым нічога канкрэтнага не праводзілася ў гэтым напрамку. Кіруючыя работнікі канторы, у тым ліку і некаторыя члены бюро ячэйкі, нічога ня робяць, каб аўладаць беларускай мовай і ўжываць яе у штодзённай рабоце. Парт'ячэйка не рэагуе на факты пасыўнага супраціўленьня беларусізацыі, як прыміранцтва да атпору з відаў вялікадзяржаўнага шавінізму.

К. Х.

Пастанова

ЦК КП(б)Б АБ УСЕСАЮЗНЫМ КОНКУРСЕ НІЗАВОГА ДРУКУ, АБВЕШЧАНЫМ «ПРАЎДОЙ».

1. АДЗНАЧЫЦЬ ВЫКЛЮЧНА ВАЖНАЕ ПАЛІТЫЧНАЕ ЗНАЧЭНЬНЕ АБВЕШЧАНАГА ГАЗЭТАЙ «ПРАЎДА» УСЕСАЮЗНАГА КОНКУРСУ НІЗАВЫХ ГАЗЭТ САЎГАСАЎ, КАЛГАСАЎ І МТС НА ЛЕПШУЮ РАБОТУ ПА АРГАНІЗАЦЫЯНА-ГАСПАДАРЧЫМ УМАЦАВАНЬНІ КАЛГАСАЎ.

УСЮ РАБОТУ ПА КОНКУРСЕ ПРАВОДЗІЦЬ ПАД ЛЁЗУНГАМ «СПРАВА АРГАНІЗАЦЫІ І ПРАВЯДЗЕНЬНЯ КОНКУРСУ «ПРАЎДЫ» — СПРАВА УСЁЙ КП(б)Б, УСЁЙ ПРАЛЕТАРСКАЙ ГРАМАДЗКАСЬЦІ БССР». РАБОТУ ПА КОНКУРСЕ ЗЛУЧЫЦЬ З АРГАНІЗАЦЫЯЙ МАСАВАЙ ПРАВЕРКІ ТАГО, ЯК НА МЯСЦОХ АЖЫЦЬЦЯЎЛЯЮЦЦА ПАСТАНОВЫ ЦК УСЕКП(б) І ЦК КП(б)Б АБ НІЗАВЫМ ДРУКУ І РАБСЕЛЬКОРАЎСКІМ РУХУ І ПРЫНЯТЫЯ НА ПАДСТАВЕ ГЭТЫХ ПАСТАНОЎ РАШЭНЬНІ 2-ГА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ РАБСЕЛЬВАЕНКОРАЎ.

2. АБАВЯЗАЦЬ ГК І РК КП(б)Б ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ СЫСТЭМАТЫЧНАЕ АПЭРАЦЫЙНАЕ КІРАЎНІЦТВА І ДАПАМОГУ ПАРТЫЙНЫМ ЯЧЭЙКАМ/ВА УЗНАЧАЛЕНЬНІ ЎСЁЙ РАБОТЫ ПА КОНКУРСЕ (ЗАСЛУХОЎВАНЬНЕ ДАКЛАДАЎ ЯЧЭЕК НА БЮРО РК, КАМАНДЫРАВАНЬНЕ ЎПАЎНАВАЖАНЫХ, СТВАРЭНЬНЕ РАННЫХ ФОНДАЎ ПА ПРЭМІЯВАНЬНІ ГАЗЭТ І Г. Д.)

НА ГАРАДЗКІХ І РАЁННЫХ ПАРТЫЙНЫХ КАНФЭРЭНЦЫЯХ ЗАСЛУХАЦЬ СПЭЦЫЯЛЬНЫЯ ПАВЕДАМЛЕНЬНІ АБ ЗНАЧЭНЬНІ І ХОДЗЕ КОНКУРСУ. ФРАКЦЫІ ЦПСПБ ДАЦЬ УКАЗАНЫЯ УСІМ ПРАФАРГАНІЗАЦЫЯМ АБ КАНКРЭТНЫХ ФОРМАХ ІХ УДЗЕЛУ Ў КОНКУРСЕ. СКАРЫСТАЎШЫ ДЛЯ ГЭТАЙ МЭТЫ ВОПЫТ ПЕРАДАВЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ МЕНСКУ.

3. У ДАДАТАК ДА РАНЕЙ ВЫЗНАЧАНЫХ КУЛЬТПРОПАМ ЦК КП(б)Б МЕРАПРЫЕМСТВАЎ ПА КОНКУРСЕ ДАРУЧЫЦЬ КУЛЬТПРОПУ ЦК РАЗАМ З КОНКУРСНАЙ КАМІСІЯЙ ПРЫ РЭДАКЦЫІ ГАЗЭТЫ «ЗЬВЯЗДА»: а) ПРЫМАЦАВАЦЬ ДА РЭДАКЦЫЙНЫ І ЧАСТКІ ГАРАДЗКІХ ГАЗЭТ КАНКРЭТНУЮ ГРУПУ РАЕНАЎ ДЛЯ АКАЗАНЬНЯ ІМ ПАСТАЯННАЙ ДАПАМОГІ Ў СПРАВЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ КОНКУРСУ; б) ВЫЗНАЧЫЦЬ 25 САЎГАСАЎ, КАЛГАСАЎ І МТС, У ЯКІЯ КАМАНДЫРАВАЦЬ НА МЕСЯЦ РАБОТНІКАЎ ЦЭНТРАЛЬНЫХ (УКЛЮЧАЮЧЫ РАДЫЁ-ГАЗЭТЫ) І ЧАСТКІ ГАРАДЗКІХ ГАЗЭТ ДЛЯ НАЛАДЖАНЬНЯ РАБОТЫ Ў МЯСЦОВАЙ НАСЬЦЕННАЙ ГАЗЭЦЕ, АСАБЛІВА Ў ГАЛІНЯХ АРГАНІЗАЦЫЙНА - ГАСПАДАРЧАГА УМАЦАВАНЬНЯ КАЛГАСАЎ.

4. СТВАРЫЦЬ УСЕБЕЛАРУСКІ ПРЭМІЯЛЬНЫ ФОНД ДЛЯ КАЛГАСАЎ, САЎГАСАЎ, МТС РЭДАКЦЫЯ РАЕННЫХ І НАСЬЦЕННЫХ ГАЗЭТ. ДАРУЧЫЦЬ НАРКАМЗЕМУ, КАЛГАСЦЭНТРУ, РЭДАКЦЫЯМ ГАЗЭТ, ПРАФСАЮЗАМ І КАМІТЭТУ ПА СПРАВАХ ДРУКУ СНК ВЫЛУЧЫЦЬ У ФОНД АДПАВЕДНЫЯ СРОДКІ.

5. ПАСТАНОВУ АПУБЛІКАВАЦЬ У ДРУКУ.

Мацней агонь па зброяносцах Троцкага

«Трацкізм ёсьць перадавы атрад контр-рэвалюцыйнай буржуазіі.

Вось чаму лібэралізм у адносінах да трацкізму, хаця-б разьбітага і замаскаванага, ёсьць галавацяпства, якое мяжуе са злачынствам, здрадай рабочай клясе...

Вось чаму нельга дапускаць літаратурную дыскусію з трацкісцкімі кантрабандыстамі».

Так пісаў тав. Сталін у сваім апошнім лісьце «Аб некаторых пытаньнях гісторыі бальшавізму».

У гэтым лісьце тав. Сталін з надзвычайнай яснасьцю выкрыў мапэўр трацкістаў, кантрабандыстаў і трацкізму, якія праводзяць сваю кантрабандную работу з флянгу гісторыі партыі і гісторыі рэвалюцыйнага рабочага руху.

Усім вядома, што паміж ленінізмам і трацкізмам на ўсім працягу гісторыі партыі ішла барацьба на зьнішчэньне.

Калі Троцкі прыйшоў у бальшавіцкую партыю, ён сваіх атручаных стрэлаў супроць бальшавізму пя зьнішчыў, а захаваў глыбока за-пазухай, каб у «спрыяючы» момант зноў іх выпусьціць па партыю.

Гэта Троцкі зрабіў у сваёй кнізе «Новы курс», і з асаблівым запалам—у кнізе «Урокі Акцябра». Як аформіў Троцкі сваю атаку на бальшавізм? Ён пусьціў у зварот «тэорыю» аб «пераўзброеньні» бальшавізму.

Партыя з тав. Сталіным па чале зараз-жа выкрыла мапэўр Троцкага і выявіла сутнасьць атручанай зброі аб «пераўзброеньні».

У чым сутнасьць гэтай «тэорыі»? Сутнасьць яе вось у чым.

Па Троцкаму сапраўдны ленінізм быў да рэвалюцыі 1917 году, у часы рэвалюцыі, і пасьля яе—рэакцыйнай плынню ў адносінах да сацыялістычнай рэвалюцыі.

Чаму-ж ня выкрылася рэакцыйная сутнасьць ленінізму ў 1917 г.? Таму і толькі таму,—адказвае Троцкі і ў хорыму яго зброяносцы,—што ленінізм «пераўзброіўся», г. зн., Ленін адкінуў сваю «рэакцыйную» зброю, запазычыў «вострую пралетарскую» зброю Троцкага, Ленін адмовіўся ад сябе, трацкізм (пахай па форме называецца ленінізмам—інакш не адурачыш) жыве.

Ні трэба праводзіць дыскусіі наконт «тэорыі» «пераўзброеньня», даводзіць шмат якімі вытрымкамі з Леніна, што Ленін не пераўзброіўся?

Гэта было-б простым злачынствам, простай здрадай ленінізму, як вучыць нас тав. Сталін.

Другім бокам «тэорыі» «пераўзброеньня» ленінізму зьяўляецца наклёп трацкістаў на Леніна ў тым, што Ленін да вайны недаацэньваў небясьпекі цэнтрызму ў II Інтэрнацыянале, у тым, што люксембургіянства якраз і было сапраўды рэвалюцыйна-пралетарскім «раўчаком», які ўліўся ў Камінтэрн побач з іншымі «левымі раўчакамі».

Здавалася-б, што пасьля ліста тав. Сталіна кантрабандысты ад трацкізму і зброяносцы Троцкага будуць бязьлітасна выкрыты, з імі ня будзе даны зьнішчальны агонь.

Адпак, на справе паасобныя кіраўнікі таварыства гісторыкаў-марксыстаў у Беларусі, як тав. Сэрбэнта, пры абгаварэньні ліста тав. Сталіна не пайшлі па шляху, вызначаным у гэтым лісьце.

Справа ідзе аб зброяносцы Троцкага—аб тав. Югаве.

Тав. Югаў выпусьціў працу «Савецкі ў першы перыяд рэвалюцыі» ў 1927 годзе. Што павінен-быў і змогбы зрабіць бальшавіцкі гісторык, асьвятляючы гісторыю саветаў у першы перыяд рэвалюцыі?

Бальшавіцкаму гісторыку зусім лёгка было-б паказаць, як бальшавіцкая партыя, верная сваёму стратэгічнаму плану аб перарастаньні буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў сацыялістычную, ішла да сацыялістычнай рэвалюцыі, змагаючыся з дробна-буржуазнымі партыямі, заваёўваючы большасьць у саветах, падрыхтоўваючы іх да захвату ўлады, да дыктатуры пралетарыяту.

Так зрабіў-бы бальшавіцкі гісторык.

Што робяць зброяносцы Троцкага—Югавы—з гісторыяй саветаў у 1917 годзе.

Югавы фальсыфікуюць гісторыю, Югавы ператвараюць гэтую фальсыфікаваную гісторыю саветаў у разгорнуты сьцяг трацкі му аб поўным «пераўзброеньні» ленінізму.

Пачынаючы Югавы ціхенька падбіраюцца да атакі.

«Зьвяржэньне самадзяржаўя дазарыентавала на першы час нават насобныя палітычныя партыі» (стар. 114). Далей чытач асьцярожна падводзіцца:

«Падзеі разьвіваліся з выключнай хуткасьцю, між тым, усе партыі, нават пралетарская, ня толькі не фарсавалі падзей, але баялісь пасьвалі за імі» (Падкрэсьлена намі стар. 116.

Такім чынам ленінская партыя фальсыфікатарамі ставіцца на адну палічку з усімі буржуазнымі і дробна-буржуазнымі контр-рэвалюцыйнымі партыямі і падносіцца чытачу, як партыя хвасьціцкая, якая кульгае ў абозе гісторыі.

Далей ідзе наступны трацкісцкі наклёп.

«Партыйная ідэалёгія, палітычны зместлёзунгаў, якія высоўгаліся ў першы перыяд, перспэктывы разьвіцця рэвалюцыі, якія намячаліся, ацэнка сацыяльнага яе характару, тактычная лінія, якая была ўстаноўлена ў залежнасьці ад перспэктыў і ацэнкі,—усё гэта паступальным рухам рэвалюцыі аказалася праўзойдзеным за даволі хуткі час». (Падкрэсьлена намі).

Ясна? «Рэакцыйны ленінізм пераўзброіўся»,—кідае кліч Троцкі.

«Увесь ленінізм аказаўся праўзойдзеным у хуткі час»—растлумачвае кліч Троцкага яго вучань, яго зброяносец—Югаў.

Што застаецца ад ленінізму ў фальсыфікатараў гісторыі—Югавых? Што было «праўзойдзена за даволі хуткі час» у ленінізме?

Партыйная ідэалёгія, стратэгія і тактыка бальшавізму, увесь марксызм-ленінізм у гісторыі фальсыфікатараў выкідваецца за борт, як рэакцыйны хлам.

Для кожнага бальшавіка пасьля ліста тав Сталіна ясна, што ніякіх дыскусій з фальсыфікатарамі з трацкісцкімі кантрабандыстамі ня можа быць. Абавязак кожнага камуніста выкрыць трацкісцкую кантрабанду, выкрыць на клёпніцкае цьверджаньне, што стратэгія і тактыка бальшавізму, што ленінізм аказаўся праўзойдзеным. Іменна пад кіраўніцтвам ленінскай партыі, на аснове бальшавіцкага стратэгічнага плану, ленінскай тактыкі, рабочая клясе перамагла ў Кастрычніку.

У гэтай сваёй рабоце Югаў, выходзячы з інтарэсаў трацкісцкай арганізацыі, выкідвае ролю Троцкага пад'ракор фактам і абгаворваючы ходу падзей, замазваў памылкі Каменева. Югаў імкнецца замазаць сапраўдную ролю правадыроў Кастрычніцкай рэвалюцыі —Леніна і Сталіна.

Здавалася-б, што пасьля адпуўленьня ў партыі, пасьля сваёй заявы аб адмаўленьні ад трацкізму, простым абгаворам Югава было выкрыць сваю трацкісцкую гістарычную работу.

Югаў гэтага не зрабіў.

Нават на сходзе таварыства гісторыкаў-марксыстаў пры абгаварэньні ліста тав. Сталіна зноў разго пуціў крытыкі сваіх трацкісцкіх цьверджаньняў. Югаў пачаў «разьбіваць» сваіх апанэнтаў.

Трэба таксама адзначыць пякрытычныя адносіны да Югава з боку кіраўніцтва т-ва гісторыкаў марксыстаў, што выявілася: 1) т. Сэрбэнта ў сваім дакладзе зусім ня спыніўся на гэтай трацкісцкай кантрабандзе Югава; 2) На працягу некалькіх месяцаў ня было па-бальшавіцку раскрытыкавана вялікадзяржаўнае ўхілісцкае пераленьне Югавым камуністаў на вялікарасійскіх, беларускіх, украінскіх. Гэта зьяўляецца праяўленьнем гнілога лібэралізму, з якім патрэбна самая бязьлітасная барацьба.

Са зброяносцамі Троцкага—з Югавымі ня дыскусіюць, іх выкрываюць, на іх накіроўваюць бальшавіцкі зьнішчальны агонь.

Р.

Дадатковая падпіска на пазыку „3-га рашаючага"

Новыя кадры рабочых уцягваюцца ў падпіску

— На заводзе імя Варашылава разгарнулася дадатковая падпіска на пазыку «3-ці рашаючы». Асабліва добра праходзіць падпіска на кацельным цэху. За пару дзён рэалізавана на гэтым цэху аблігацый на 4.077 рублёў. Упередзе ідзе брыгада т. Акуліча, якая дала 585 рублёў. Падпіска праходзіць пад знакам поўнага ахопу ўсіх новых кадраў рабочых і адсталых груп.

— БАБРУЙСК. (Наш кар.). Дадатковая падпіска на пазыку ў мэтах поўнага ахопу новых кадраў рабочых праходзіць нездавальняюча.

Камісія садзейнасьці нічога ня робіць, каб уцягнуць у падпіску ўсе 100 проц. рабочых і служачых. Прафесыянальныя арганізацыі мала цікавяцца пытаньнем рэалізацыі пазыкі.

Перадавікамі дадатковай падпіскі зьяўляюцца Саюзтранс і саюз работнікаў асьветы, дзе ахоплена звыш 100 проц. месячнага фонду зарплаты. Адстаюць буйнейшыя прадпрыемствы гораду.

1 млн. руб. у пазыку дзяржаве

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). З вялікім посьпехам праходзіць па горадзе дадатковая падпіска на пазыку.

ГОМСЕЛЬМАШ абвясьціў конкурс на лепшы цэх і брыгаду па дадатковай падпісцы. На сацспаборніцтва выклікан завод імя Ланцуцнага.

Завод «Рухавік рэвалюцыі» даў 4.600 рублёў, лесазавод — 6.500 рублёў. Завод «Пралетары», дзякуючы разгортванню сацспаборніцтва паміж цэхамі, дабіўся вельмі значных вынікаў. Узорную работу правёў такарны цэх заводу, дзе падпіска перавысіла месячны фонд зарплаты.

Яўрэйская буржуазія дзякуе...

Яўрэйскія пагромы, якія з такой сілай бушавалі ў лістападзе ва ўсіх польскіх унівэрсытэтах і буйнейшых гарадох, пачынаюць, быццам сьціхаць. Але гэта толькі здаецца, чытаючы польскую буржуазную прэсу, якая сапраўдныя размеры пагромаў старанна затушоўвае.

Пагромы спынілісь, але толькі ва ўнівэрсытэтах, ды і то **часткова.** Затое ў правінцыяльных гарадках і мястэчках фашысцкія баёўкі пад апекай паліцыі разгуляюць нішчэ і зараз па яўрэйскіх кварталах, зьбіваючы жанчын, дзяцей...

Ня ўсёй Польшчы абгываюцца «набажэнствы за душу» Вацлаўскага — забітага студэнта-фашыста. Зусім ясна, што гэтыя «набажэнствы»—повад для новых антысэміцкіх выпадаў і пагромаў. Так, «Газэта Варшавска» ад 5 сьнежня паведамляе, што такія «набажэнствы» ў Цеханове і Калішы ператварыліся ў антыяўрэйскія дэманстрацыі. У Калішы — «панує фэрмент і абурэньне». Перавёўшы на больш зразумелую мову гэта азначае, што «дэманстрацыі» ператварыліся ў пагромы, у масавае зьбіваньне яўрэяў. Налёты пачалі і ў Ланчыце («Газэта Варшавска» ад 9 сьнежня). Пад знакам «помсты» за сьмерць Вацлаўскага разгортваюцца новыя пагромы.

«Газэта Варшавска» — орган эндэкаў — і далей вядзе выразную антысэміцкую кампанію, аддаючы ёй на сваіх старонках пачэсныя месцы.

Усюды энэргічна прапагандуецца дзёгтр экзамінчнага байкоту яўрэяў. Прапаганду гэту зусім легальна вядзе антысэміцкая арганізацыя «Ліга зялёнай іскры». У сваіх адозвах «Ліга» заклікае ня прымаць на працу яўрэйскіх рабочых і рамесьнікаў, не карыстацца яўрэйскімі дактарамі і адвакатамі, нічога ня купляць у яўрэйскіх крамах.

Урад і буржуазная прэса ўсіх колераў і адценьняў прыкладаюць усе сілы, каб толькі паглыбіць, распаліць шавіністычныя, антысэміцкія настроі сярод дробнай буржуазіі і найбольш адсталых пластоў пралетарыяту.

Робіць гэта зусім адкрыта і **урадавая** прэса. Так, у **Вільні,** дзе пагромы мелі найбольш **востры** характар, памешчыцкае «Слово», рэдактарам якога зьяўляецца вядомы пілсудчык **Мацкевіч,** сыстэматычна прапаведуе антысэміцызм. У трох нуме ох засаб. (24, 25 і 26 лістапада) «Слово» зьмяшчае перадавыя, прысьвечаныя «яўрэйскаму пытаньню». Перадавыя маюць выразна антысэміцкі **правакацыйны** характар.

У перадавой ад 24 лістапада пад назвай «Унівэрсытэты», «Слово» аддае шмат месца яўрэйскім студэнтам, што навучаюцца на зямляробчым факультэце. Гэта прыводзіць аўтара перадавой у шаленства. Ён ніяк ня можа згадзіцца, што **яўрэі** вучацца на **зямляробчым** факультэце:

«...Ня ведаю гэтых яўрэяў-зямляробаў. Магу дапусьціць, што гэта найбольш уважлівыя слухачы. Але ня гледзячы на гэта, яны бязумоўна зьяўляюцца прычынай паніжэньня аўтарытэту зямляробчага факультэту, робячы навуны няўлавімую крыўду. ДРАЖНЯЦЬ СВАЁЙ ПРЫСУТНАСЬЦЮ СТУДЭНТАЎ, ЯКІЯ ШЧЫРА АДДАНЫ ПРАДМЕТУ*).

Гэта азначае поўную салідарнасьць са студэнтамі-грамілямі, поўнае падтрыманьне іх «праграмы» ў барацьбе з яўрэйскім студэнцтвам.

Адпак, «Слово» разумее, што студэнцкія авактуры самі па сабе ня могуць мець належнага эфэкту, што для таго, каб разьбіць адзіны рэвалюцыйны фронт патрэбны яўрэйскія пагромы ў больш шырокім маштабе, пры тым ня ў сьценах унівэрсытэту, а ў кварталах яўрэйскай беднаты, у рабочых кварталах гарадоў і мястэчак. Видучы ў прэсе пагромную кампанію, пагкоўваючы хуліганскія элемэнты на яўрэйскую беднату, **арганізуючы пагромы** — фашысцкая ўлада выразна забараняе пагромшчыкам паказвацца нават на вочы **буйной яўрэйскай буржуазіі.** У польскай фашысцкай прэсе знаходзім нават выхвальваньне творчай ролі **ГЭТАЙ** часткі яўрэяў у эканамічным жыцьці дзяржавы. Так, мапархічнае «Слово» (25 лістапада) у перадавой піша:

«Былі яны ў нас і ёсьць арганізатарамі шматлікіх прадпрыемстваў, нашага экспарту, банкаў і г. д.».

Прыводзіцца, як прыклад «вядомы ўласьнік Відзэўскай мануфактуры ў Лодзі — **Кон».** «Слово» падкрэсьлівае, што

«... Дзякуючы яго спруту і арганізацыйнаму таленту тысячы польскіх рабочых знаходзяць працу, А ЯГО МАНУФАКТУРА МАЕ ДАЛАТНЫ ЎПЛЫЎ НА НАШ ГАНДЛЁВЫ БАЛЯНС».

Яўрэйская буржуа прымаюць **такі самы ўдзел у кіраўніцтве дзяржавай, як і польскія капіталісты як і польская буйная буржуазія.**

Затое «Слово» з абурэньнем гаворыць аб «паразытным яўрэйскім пытоўне, які займаецца дробным гандлем і пасярэдніцтвам», аб яўрэйскім пралетарыяце. Іх грамілі, бязумоўна, даходзіцца, і гэта зьяўляецца «шляхетным парывам сэрца». Такія «шляхетныя парывы сэрца» польская буржуазная прэса, уключаючы сюды і **ўрадавую,** з усіх сіл стараецца распальваць.

Адчуваючы грознае нездаваленьне мас сёньнішнім становішчам, адчуваючы ў гэтых масах магутныя рэвалюцыйныя хваляваньні, фашызм імкнецца накіраваць нездаваленьне мас **на контр-рэвалюцыйны шлях пагромаў.**

Адначасова пагромы павінны адыграць ролю свайго роду **карных экспэдыцый** для задушэньня рэвалюцыйнага хваляваньня сярод яўрэйскай беднаты. Пагромамі фашызм хоча прыкусіць яўрэйскую дробную буржуазію зьйсьці з **рэвалюцыйнага** шляху, хоча прымусіць **не падтрымаць** дыктатуру Пілсудзкага.

Побач з ваенна-палявымі судамі, побач са сьмяротнымі прысудамі пагромы — як адзін з відаў белага тэрору і наступленьня на адзіны рэвалюцыйны фронт — **зьяўляюцца новым крокам у падрыхтоўцы ваеннай інтэрвэнцыі супроць СССР.**

Але фашызм пралічыўся. Гадамі зацятай барацьбы з клясавым ворагам працоўныя масы Польшчы навучыліся адрозьніваць **сваіх** ад ворагаў. **Правакацыя фашызму выклікала глыбокае абурэньне і гнеў у самых шырокіх рабоча-сялянскіх масах усіх нацыянальнасьцяй.** Гэтыя, пазьмерна важныя, паказальнікі **клясавай сьвядомасьці** зьявілі сваё яркае выяўленьне ў тым магутным адпоры, які далі пагромшчыкам масавыя дружыны самаабароны і абароны яўрэяў, дружыны, у склад якіх уваходзілі працоўныя **РОЗНЫХ** нацыянальнасьцяй.

Характэрныя ў гэтых адносінах зьяўляюцца падзеі ў Вільні. 12 лістапада пагромы дасягнулі там свайго кульмінацыйнага пункту. Фашысцкае студэнцтва разам з вулічнымі хуліганамі цэлай бандай дэманстрацыйна рушыла ў напрамку яўрэйскіх кварталаў. Па дарозе яны выбівалі шыбы ў яўрэйскіх кватэрах, грабілі яўрэйскія крамы, зьбівалі яўрэяў. Вестка аб пагроме маланкай разьнеслася па ўсім горадзе. Праз самы кароткі час пагромшчыкі натыкнуліся на магутную дружыну самаабароны. Дружына складалася з рабочых і студэнтаў-яўрэяў, а таксама з рабочых іншых нацыянальнасьцяй. Завязалася ўпартая барацьба. Калі перамога выразна пачала хіліцца ў бок рабочых — як з-над зямлі зьявілася **паліцыя.** Яе пагромшчыкі прывіталі крыкам: **«Няхай жыве паліцыя!»** Паліцэйскія пакінуліся **на рабочых,** зьбіваючы іх прыкладамі, гумавымі палкамі і арыштоўваючы. У часе бойкі было паранена 5 студэнтаў-фашыстаў і паліцэйскі. З боку дружыны самаабароны — 25 параненых.

Апалёгічныя падзеі адбыліся ў **разе** іншых гарадоў Заходняй Беларусі і Польшчы. Такім красамоўным быў адказ працоўных мас на правакацыю фашызму. Салідарныя выступленьні працоўных розных нацыянальнасьцяй супроць пагромшчыкаў зьяўляюцца доводам паглыбленьня інтэрнацыянальнай салідарнасьці, доводам палітычнага росту рабоча-сялянскіх мас. Усе спробы фашызму разьбіць адзінства рэвалюцыйнага фронту цярпяць правал. Пралетарыят і працоўныя ўсіх нацый гуртуюцца вакол лёзунгаў кампартыі, усё больш рашуча становяцца на рэвалюцыйны шлях выхаду, з крызісу, уздымаюцца на бязьлітасную барацьбу супроць фашысцкай дыктатуры, у абарону СССР.

На фоне пагромаў надзвычай ярка выявілася роля яўрэйскай буржуазіі. Яна ў імя сваіх клясавых інтарэсаў салідарызавалася з пагромнай палітыкай польскага фашызму. У той час, калі ўрад легал зуе пагромы, калі паліцыя, афіцэршчына і паўвайсковыя фашысцкія арганізацыі зьяўляюцца перадавікамі пагромаў, калі ўрад дазваляе чорнасотным «лігам» адкрыта арганізаваць эканамічны байкот яўрэяў — у гэты самы час соймавае прадстаўніцтва яўрэйскай буржуазіі выдае ганебную адозву, у якой ДЗЯКУЕ ўрад за яго «барацьбу» з пагромшчыкамі, за тое, што ён «ВЫКАНАЎ СВАЕ АБАВЯЗКІ».

Яўрэйскі сацыял-фашызм, салідарызуючыся цалкам і поўнасьцю са стаповішчам ППС*), адыгрывае такую-ж самую ролю, як і яго польскі брат па прафсэкцыі. Бунд са скуры лезе, каб толькі даказаць, што за пагромы ўрад НЯ МОЖА адказваць, што АДЗІНЫЯ арганізатарамі пагромаў зьяўляюцца хуліганы. Такім чынам, яўрэйская буржуазія і сацыял-фашысткі Бунд — усімі сіламі і сродкамі ВЫГАРАДЖВАЮЦЬ з пагромаў фашысцкі ўрад, дапамагаючы яму адыгрываць ганьбічную ролю... абаронцы яўрэйскі

Дзесяцігадовы юбілей паэта Александровіча— перамога беларускай пралетарскай літаратуры

НЯ СПЫНЯЦЦА НА БУЙНЫХ ПОСЬПЕХАХ, НЯЎХІЛЬНА ІСЬЦІ ПА ШЛЯХУ СТВАРЭНЬНЯ МАГНІТАБУДАЎ ЛІТАРАТУРЫ

ТВОРЧЫ РОСТ АНДРЭЯ АЛЕКСАНДРОВІЧА

Пралетарская літаратура Беларусі разам з усёй рабочай клясай БССР адзначае 10-гадовы юбілей творчасьці аднаго з буйнейшых сваіх пралетарскіх пісьменьнікаў Андрэя Александровіча.

Не для самаўсхваленьня, не для капанізацыі і фетышызацыі пісьменьніка адзначаем мы гэты юбілей. Нам, пралетарскім рэвалюцыянэрам, такі падыход да творчасьці таварыша па барацьбе вялёзна а арганічна чужым і непрымлемым. Мы адзначаем юбілей для таго, каб крытычна прагледзець і асмысьліць пройдзены шлях, каб ускрыць сапраўдныя рухаючыя прычыны разьвіцьця пралетарскай літаратуры і на аснове гэтага яшчэ з большай сілай узяцца за перамаганьне і ліквідацыю адставаньня пралетарскай літаратуры ад сучаснага ўзроўню сацыялістычнага будаўніцтва, ад стварэньня літаратуры, вартай нашай вялікай эпохі.

Пралетарская літаратура расла і разьвівалася ў жорсткай клясавай барацьбе, якую вяла і вядзе рабочая класа пад ленінскім кіраўніцтвам камуністычнай партыі за пабудову сацыялізму.

Пралетарская літаратура заўсёды вялася, па меры свайго разьвіцьця, зброяй сваёй клясы ў яе барацьбе супроць клясавага ворага, супроць сілы і традыцый старой грамады, за пабудову сацыялізму.

Творчасьць Андрэя Александровіча, на пэўным этапе яе разьвіцьця ўваходзіць у рочышча пралетарскай літаратуры, як сустаўная і неаддлучная яе частка. Дзесяцігадовы творчы шлях паэты — складаны.

«Сацыяльная прырода» творчасьці Александровіча не зьяўляецца нечым раз назаўсёды даным, канчаткова прадумоўленым, як гэта лічаць і забываюць галовы «таму перверзійскамеханістаўючыя літаратурныя павучкі, што знайшлі сабе гасьцінны прытулак на старонках «Узвышша» (гл. № 9-10 за 1930 год, артыкул Зубко). Творчасьць Александровіча ёсьць жывы, рэальны працэс росту, перамаганьня таго мяшчанскага, дробна-буржуазнага, што характарызуе першыя гады творчага шляху паэты.

Андрэй Александровіч прышоў у беларускую літаратуру, як выхадзец з дробна-буржуазнага мяшчанскага асяродзьдзя. На працягу значнага часу ў яго творчасьці выяўляліся пазасобныя бакі ідэалёгіі і густаў дробнай буржуазіі, гарадзкога мяшчанства, іх уплыўленьне аб рэчаіснасьці. У раньняй творчасьці Александровіча мы знаходзім і лірычнасьць на адрасе ветру, любаваньне вуліцай з яе лямпамі і ліхтаром, захапленьне начной цішынёю і «шапатлівым звонам» і г. д.

На гэтым этапе ўплыўленьне паэта аб сацыяльнай рэчаіснасьці граніць паверхоўнасьцю, прымітыўнасьцю. Адчуваючы сілу рэвалюцыі і рабочай клясы, суб'ектыўна імкнучыся да яе, гым меш Александровіч яшчэ не разумеў рэвалюцыі ў яе сутнасьці. Ён фіксуе «рамы фабрычных вакон», «шапкі фабрычных труб». Часамі пісьменьнік праўда, прасякае і за рамы фабрычных вакон, бачыць там «сталь—машыну», але чалавек і яго гераічная праца не адлюстроўваецца. Часта машына супроцьставіцца чалавеку.

Творчасьць Александровіча першага яе этапу — урбаністычная творчасьць. Але ўрбанізм Александровіча меў свае асаблівасьці — у большасьці актыўным аб'ёкту.

Праз дробна-буржуазную, мяшчанскую шалуху прабіваўся здаровы, рэвалюцыйны струмень, струмень, які характарызуе здаровую тэндэнцыю, якая з цягам часу, пад уплывам узрастаючай пралетарскай літаратуры, набыла агульнае характарызуючае значэньне, перарасла ў вядучы пачатак. Яшчэ ў вусім раньніх вершах, у гарадзкім ветру чуецца яму радасьць рабочая, чуюцца сьпевы барацьбы:

«Подых ветру вабіць радасьць у рабочай,
чырвань вуліц цешыць спевам барацьбы»...

Адчуваючы і апяваючы стыхію рэвалюцыі, якая прынесла вызваленьне працоўным ад уціску і эксплёатацыі, паэта часамі ўлаўлівае і тое, што «мяжная стыхія» мае сваёй асновай рабочы рух, барацьбу пад кіраўніцтвам рабочае клясы. Праўда, гэта яшчэ пявыразна ўсьведамляецца поэтай, але самае галоўнае, што ён адчувае ўжо і пачынае усьведамляць усё гэтае.

Вось чаму пацдэмы і іх прыяцелі Кундзіны ставілі стаўку на кампрамісную паэта. Пачынаючы ад Бабарэкі і канчаючы Байковым і Жылуновічам пацдэмы і пацапартуністы замоўчвалі творчасьць Александровіча.

Далейшы рост паэта вядзе да ўсьведамленьня і сьвядомага адлюстраваньня рабочае клясы ў яго творчасьці. Наш час уяўляецца Александровічу, як час рабочых, які вызначаецца напаваньнем працы, напаваньнем сілы рабочай.

Усё гэта ўмацняе веру ў рабочую клясу, дае сілу і бадзёрасьць, творчы запал і імпэт для творчага ўзьдыму.

«Заўтрае кінжыць
сталёвай машынай,
Узьняўшы няўпынна
дзён сьветлых узьлёт».

Гэтая вера ў «сьветлыя дні» параджае захапляючай сілы і бадзёрасьці, высока мастацкія, глыбока насычаныя рэвалюцыйным пафасам вершы, як напрыклад, — **«ТАВАРЫШЫ, З НАМІ ВЯСНА».**

Паэту захапляе барацьба за «заўтрага сьветлыя далі», ён ня мірыцца з нудлівым воем песень лірыкаў кулацтва, а таксама і дэзэртырамі, якія бягуць з вёскі «ня вывеўшы у полі заросшы палын», бягуць у горад, якія пападалі ў асяродзьдзе дробна-буржуазнай багэмы і таму «дзіка ім песьня ста лёвых машын», і таму

«Горад іх давіць, як пылам кастрыца
Як вёску іх родную горкі палын».
«З мыцьцём ня суладзіўшы,
як на чужыне,
пакінуўшы вёску, сьціраюць асфальт.
Любоў да жыцьця напрыкметна ў іх стыне,
ня вабіць іх заўтрага сьветлая даль».

Александровіч узьнімаецца на ўзровень разуменьня сапраўдных задач, сапраўды рэвалюцыйна-дзейнай ролі, сапраўды рэвалюцыйнай паэзіі. **Ён прысьвячае сваю творчасьць карчаванню «палыну травы», усяго старога, усяго таго, што гняце яшчэ вёску.**

**«Пайду я прасторам
плоской Беларусі,
пайду па шляхох беларускіх дапін.
Горад, мой родны, я не зракуся
гучных мэлёдый сталёвых машын.
Толькі пайду я далінай вазёраў,
там пакарчуем палын-траву».**

(1926 год)

У гэтым сіла, і гэта ёсьць тое, што робіць **Александровіча паэтай пралетарыяту**, узьнімае яго творчасьць на ўзровень задач, што сталі перад пралетарыятам на тым гістарычным этапе.

Узьніўшыся сваёй творчасьцю на ўзровень задач рэвалюцыйнай клясы, паэта ня можа хладнакроўна сузіраць і мірыцца з тым, што другая частка Беларусі пад уціскам, што:

«Сёньня... там... будуюць казэматы»,

што:

«Сёньня... там... нявядамы прыгон».

Ён глыбока эмацыянальным, актыўна-пазыўным творам, выклікаючым непрымірымую клясавую нянавісьць, клейміць разьюшаных папоў «Пілсудзкіх, Мураўёвых», а панская Польшча выкрывае

«Як царская Расія
Краіна сьмерці!.. Краіна цёмных крат!»

На пэўным этапе сваёй творчасьці Александровіч падпадае пад уплыў беларускага нацыяналізму. Гэты ўплыў знаходзіць сваё выяўленьне ў радзе твораў асабліва пэрыяду 1925-26 г.

Барацьба партыі супроць нацыяналізму ўзьдзейнічала на Александровіча і яго творчасьць, як магутны выхаваўчы фактар, а рост пралетарскай літаратуры замацаваў той сапраўды глыбокі пералом, які наступіў пасьля гэтага ў творчасьці Александровіча і які вызначыўся перш за ўсё ў рашучым разрыве з нацыяналізмам, у абвяшчэньні яму сьмяротнай барацьбы.

Вайна нацыяналізму, вайна ўсяму варожаму для сацыялістычнага будаўніцтва, асабліва шырока разгорнута Александровічам у яго паэме «Цені на сонцы». Паэма «Цені на сонцы» зьявілася моцнай і вострай зброяй у руках рабочае клясы, у барацьбе супроць контрэвалюцыйнага нацдэмакратызму. Таксама гэтая паэма азначала сабою новы, больш высокі этап разьвіцьця пралетарскай літаратуры, рост Александровіча. Далейшая творчасьць Александровіча («Установка», «Паэма імя вызваленьня», «Паэма пра ворага», «Нараджэньне чалавека», «Напор» і шмат вершаў), ёсьць разгортваньне і паглыбленьне таго шляху, на які рашуча стаў паэта і за які актыўна змагаецца.

Рост сацыялізму, актыўная барацьба рабочае клясы за сацыялістычную рэканструкцыю ўсіх бакоў грамадзкага быцьця, барацьба за перабудову людзкога матар'ялу, барацьба супроць клясавых ворагаў пралетарыяту, у якіх-бы яны масках не хадзілі — ёсьць асноўнае, што вызначае тэматыку творчасьці Александровіча за апошнія гады.

Гэтая тэматыка ёсьць тое, што робіць творчасьць Александровіча магутнай зброяй у руках пралетарыяту, што робіць яе актуальнай і баявой. Праўда, было-б найвялікшай шкодай для пісьменьніка і для ўсёй пралетарскай літаратуры, калі-б мы гаварылі, што гэта ёсьць ўсё тое, што магчыма дасягнуць. Пралетарская літаратура адстае ад тэмпаў, ад узроўню сацыялістычнага будаўніцтва. Гэтае адставаньне датычыць і творчасьці Александровіча.

Адставаньне пралетарскай літаратуры ад узроўню сацыялістычнага будаўніцтва перш за ўсё выяўляецца ў невыстарчальна-глыбокім і ўсебаковым партыйным асэнсаваньні і адлюстраваньні працэсу сацыялістычнага будаўніцтва.

Адзай з асноўных прычын адставаньня пралетарскай літаратуры, пазольнасьці перамаганьня і ліквідацыі гэтага адставаньня, — зьяўляецца невыстарчальнае аўладаньне нашымі пісьменьнікамі марксыцка-ленінскім дыялектычна-матэрыялістычным мэтадам. Адсюль вынікае невыстарчальна-глыбокае і ўсебаковае асмысьленьне таго новага, што нясе з сабою новы этап сацыялістычнага будаўніцтва, уступленьне краіны ў пэрыяд сацыялізму.

Шлях творчай перабудовы Александровіча цяжкі і зьвязаны са значнымі зрывамі, якія найбольш выявіліся ў такіх творах, як «Установка», «Паэма імя вызваленьня», «Паэма пра ворага» і інш. Замест глыбокага і ўсебаковага пранікненьня і асмысьленьня, мастацкага актыўна-дзейнага адлюстраваньня, багацейшага матар'ялу ў названых творах, Александровіч пайшоў па лініі ўтварэньня кантрастных і неканр[illegible] схем, любаваньня гукамі самімі па сабе, па лініі культаванн[illegible] голага тэхніцызму на павярхоўнасьці жывога матар'ялу, па лініі пасьлядоўнага паказу.

Гэта **пройдзены і асмысьлены** пісьменьнікам этап. Такія творы, як **«Нараджэньне чалавека»**, п'еса **«Напор»** сьведчаць пра тое, што **Александровіч пайшоў па правільным шляху, шляху найбольшага супраціўленьня, пры мастацкім пазнаньні і раскрыцьці праз вобразы нашае рэчаіснасьці, як шматграннага і розгастайнага адзінства, па шляху асмысьленьня і мастацкага актыўна-дзейнага адлюстраваньня шляхоў нашага руху, нашых перамог.**

Тав. Александровіч

Усё гэта абумоўліваючы больш глыбокую ідэйную насычанасьць творчасьці Александровіча, абумоўлівае і вышэйшую ступень мастацкасьці, абумоўлівае і тую актыўную ролю, якую павінна выконваць пралетарская літаратура.

Рост і посьпехі пралетарскай літаратуры наогул, рост і перабудова творчасьці Андрэя Александровіча ў прыватнасьці, — зьяўляецца **яскравым выяўленьнем і ілюстрацыяй правільнасьці ленінскай нацыянальнай палітыкі, перамогі рабочае клясы пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі ў справе барацьбы за беларускую культуру, сацыялістычную па зьмесьце і нацыянальную па форме.**

У справе росту і перабудовы творчасьці Александровіча, як **пралетарскага** пісьменьніка, рашаючую ролю адыграла **БелАПП**, ідэйна **вядучы** атрад усёй савецкай літаратуры, якая пад **кіраўніцтвам партыі** змагаецца за вялікае мастацтва бальшавізму, за **гегемонію пралетарскай літаратуры.**

Далейшы творчы рост Александровіча, як пралетарскага пісьменьніка будзе зьяўляцца важнейшым фактарам у справе заваяваньня творчай гегемоніі пралетарскай літаратуры.

Л. БЭНДЭ.

Прывітаньне тав. Галадзеда паэту Андрэю Александровічу

Аўтару „Цені на сонцы"—пісьменьніку—ЦК КП(б)Б

Дзякуючы шырокаму разгортваньню сацыялістычнага будаўніцтва і культурнай рэвалюцыі разьвіваецца і ўмацоўваецца пралетарская па зьмесьце і нацыянальная па форме культура.

Літаратурны фронт і ўвесь фронт мастацтва наогул мае вялікае значэньне, асабліва ў рэканструкцыйны пэрыяд. Перад пралетарскім літаратурным рухам, які разгортваецца пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, стаяць вялікія задачы стварэньня САЦРАЎДНАГА МАСТАЦТВА БАЛЬШАВІЗМУ.

Пралетарскі мастак павінен аўладаць марксыцка-ленінскім сьветапоглядам і мэтадалёгіяй з тым, каб творчасьць пралетарска а пісьменьніка ярка адлюстроўвала эпоху пралетарскай сацыялістычнай рэвалюцыі, эпоху гераічнай будоўлі сацыялізму ў нашай краіне, каб яна (творчасьць) мабілізавала масы на барацьбу за генэральную лінію нашай партыі, на выкананьне задач сацыялістычна будаўніцтва.

Сіла пралетарскай літаратуры ў яе інтэрнацыянальным клясавым адзінстве. Змаганьне з праяўленьнямі вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з нацыянал-дэмакратызмам — агентурай фашысцкіх інтэрвэнтаў, з шавінізмамі іншых колераў, барацьба за ідэалёгічную вытрыманасьць літаратурнага фронту, барацьба за ПАРТЫЙНАСЬЦЬ У ЛІТАРАТУРЫ—гэта ёсьць першачарговыя абавязкі пралетарскага пісьменьніка БССР.

ВІТАЮ З 10-ГАДОВЫМ ЮБІЛЕЕМ ЛІТАРАТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЬЦІ, ЖАДАЮ ДАЛЕЙШАЙ ПАСЬПЯХОВАЙ ПРАЦЫ І БАРАЦЬБЫ ЗА ГЕГЕМОНІЮ Ў ПРАЛЕТАРСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ.

М. ГАЛАДЗЕД.

Пазту рабочай клясы

Народны Камісарыят Асьветы горача вітае пралетарскага паэта Андрэя Александровіча ў дзень яго 10-гадовага юбілею.

Літаратура зьяўляецца аднэй з вастрэйшых зброй у руках партыі і рабочай клясы ў барацьбе за сацыялізм. Творы Александровіча — «ЦЕНІ НА СОНЦЫ», «НАРАДЖЭНЬНЕ ЧАЛАВЕКА», «НАПОР», ЗЬЯЎЛЯЮЦЦА КАШТОЎНЫМ УКЛАДАМ У БЕЛАРУСКУЮ ПРАЛЕТАРСКУЮ ЛІТАРАТУРУ.

Задачай пралетарскага пісьменьніка зьяўляецца барацьба за партыйнасьць літаратуры, падпарадкаваньне ўсяе сваёй літаратурна-грамадзкай работы правядзеньню генэральнай лініі партыі супроць правых і «левых» тэорый у літаратуры, дапамагла табе пазбавіцца ранейшых памылак, дапамагла стаць на правільныя пралетарскія рэйкі ў сваёй творчасьці і літаратурна-грамадзкай дзейнасьці.

Мы ўпэўнены, што Андрэй Александровіч і далей захавае тую актыўнасьць і дзейнасьць, якую ён праявіў за апошнія часы ў барацьбе за бальшавіцкую лінію ў літаратуры, у рабоце па закліку рабочых-ударнікаў, у барацьбе за мастацтва, вартае вялікай эпохі.

Пад кіраўніцтвам партыі
наперад, ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ!
Сакратарыят БелАПП'у.
ЛЫНЬКОЎ, БЭНДЭ, ГАЛАВАЧ, СЯНКЕВІЧ, ШВЭЙДЭЛЬ, ЛІМАНОЎСКІ МАЛАШЭНКА, ДУНЕЦ, МУРАШКА.

***

У рэдакцыю газэты «Зьвязда» на імя паэта Андрэя Александровіча паступілі прывітаньні ад Дзяржаўнага Выдавецтва Беларусі, ад рэдакцыі газэты «Чырвонаармейская праўда», прэзыдыуму БелЛАЧАФ і Галоўмастацтва БССР.

Юбілей Александровіча—свята рэвалюцыйнай літаратуры

Пралетарскаму паэту АНДРЭЮ АЛЕКСАНДРОВІЧУ ў дзень дзесяцігодзьдзя літаратурнай творчасьці Фэдэрацыя Аб'яднаньняў Савецкіх Пісьменьнікаў шле шчырае брацкае прывітаньне.

Юбілей творчасьці Александровіча зьяўляецца СЬВЯТАМ УСЁЙ САВЕЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ ЛІТАРАТУРЫ.

БелФАСП упэўнен, што і далей у сваёй творчасьці і літаратурна-грамадзкай дзейнасьці паэт Андрэй Александровіч з яшчэ большай напорыстасьцю і ўпартасьцю будзе змагацца за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, за стварэньне вялікага мастацтва рабочай клясы.

БелФАСП.

НАПЕРАД, ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ!

Беларускаму пралетарскаму паэту АНДРЭЮ АЛЕКСАНДРОВІЧУ—брацкае прывітаньне.

Твой дзесяцігадовы юбілей—гэта ня толькі падагуленьне барацьбы паэта, але ў значнай меры і юбілей усёй беларускай пралетарскай літаратуры.

Творчыя посьпехі паэта—вынік росту пралетарскай літаратуры, ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі.

Посьпехі паэта яшчэ не гавораць за тое, што ўся работа Андрэя Александровіча па глыбіні партыйнага асмысьленьня нашай рэчаіснасьці, па глыбіні яе дыялектычнага пазнаньня і мастацкі актыўна-дзейнага паказу поўнасьцю адпавядае вымаганьням, якія ставіць бальшавіцкая эпоха перад пралетарскай літаратурай.

Баявой задачай Андрэя Александровіча, як і ўсёй беларускай пралетарскай літаратуры, павінна быць барацьба за больш поўнае і глыбокае аўладаньне вышынямі марксыцка-ленінскага сьветапогляду, барацьба за стварэньне пралетарскай літаратурай сапраўдных Магнітабудаў.

Твае посьпехі і перамогі ў значнай ступені забясьпечаны тэй таварыскай ідэйнай дапамогай, што аказвала, табе Беларуская Асацыяцыя Пралетарскіх Пісьменьнікаў, актыўным членам якое зьяўляешся. Асацыяцыя, якая пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі вяла і вядзе змаганьне за гегемонію пралетарскай літаратуры, дапамагла табе пазбавіцца ранейшых памылак, дапамагла стаць на правільныя пралетарскія рэйкі ў сваёй творчасьці і літаратурна-грамадзкай дзейнасьці.

Мы ўпэўнены, што Андрэй Александровіч і далей захавае тую актыўнасьць і дзейнасьць, якую ён праявіў за апошнія часы ў барацьбе за бальшавіцкую лінію ў літаратуры, у рабоце па закліку рабочых-ударнікаў, у барацьбе за мастацтва, вартае вялікай эпохі.

Пад кіраўніцтвам партыі
наперад, ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ!
Сакратарыят БелАПП'у.
ЛЫНЬКОЎ, БЭНДЭ, ГАЛАВАЧ, СЯНКЕВІЧ, ШВЭЙДЭЛЬ, ЛІМАНОЎСКІ МАЛАШЭНКА, ДУНЕЦ, МУРАШКА.

***

У рэдакцыю газэты «Зьвязда» на імя паэта Андрэя Александровіча паступілі прывітаньні ад Дзяржаўнага Выдавецтва Беларусі, ад рэдакцыі газэты «Чырвонаармейская праўда», прэзыдыуму БелЛАЧАФ і Галоўмастацтва БССР.

Пленум Менскага Гаркому КП(б)Б і ГарКК

Бальшавіцкае выхаваньне—новаму папаўненьню

На пасяджэньні 15-га сьнежня аб'яднаны пленум Менскага Гаркому КП(б)Б і ГарКК КП(б)Б заслухаў даклад тав. **Янковіча і судакладчыка тав. Грыцкевіча АБ РАБОЦЕ МЕНСКАГА ГАРКОМУ ЛКСМБ.**

Менская камсамольская арганізацыя з часу сваёй першай гарадзкой канфэрэнцыі ўсвоіла задачу пасароту тварам да вытворчасьці і ў значнай ступені ўжо ажыцьцявіла яе. Расьце ўдзельная вага камсамолу на вытворчасьці і ўзьнімаецца яго роля, як бліжэйшага дапаможніка партарганізацыі.

Зараз з 8.210 камсамольцаў, якія працуюць на прамысловасьці Менску, 6.665 зьяўляюцца ўдарнікамі. У апошні час вытворча-камсамольскія ячэйкі Менску арганізавалі 106 плянава-апэрацыйных камсамольскіх груп, якія ахапляюць звыш 900 камсамольцаў; 70 тэхнічных гурткоў (2.000 чал.) і 17 рацыяналізатарскіх гурткоў.

Гэтыя посьпехі ёсьць вынік няўхільнай барацьбы камсамолу пад кіраўніцтвам партыі супроць адхіленьняў ад яе генэральнай лініі, супроць правага і «левага» апартунізму, супроць прымірэнцтва, супроць праваапартуністычных «тэорый» паступовага вырожэньня палітычнай актыўнасьці камсамолу, разрыву яго кіраўніцтва з масамі (Бутрын, Міхаў, Целяшоў).

Менская камсамольская арганізацыя дружна ўключылася ў абвешчаны «Комсомольской правдой» сталінскі паход. Ажыцьцяўленьне шасьці гістарычных умоў тав. Сталіна пастаўлена ў цэнтр увагі арганізацыі.

Камсамольскія разрахунковыя брыгады на «Камунары», «Дрэзаграцоўшчыку», «Кастрычніку», «Польмі рэвалюцыі» і «Бальшавіку» перавыконваюць свой прамфін лям. На сёньняшні дзень арганізавана звыш 100 разрахунковых камсамольскіх брыгад.

Вялікім недахопам арганізацыі і асабліва гаркому камсамолу зьяўляецца тое, што вопыт гэтых брыгад не папулярызаваны, не перанесен на другія заводы і іх вікавыя вытворчыя зьвеньні.

У Менскім раёне за апошні час арганізавана звыш 60 вясковых (калгасных і саўгасных) камсамольскіх ячэек. Адначас работа іх пастаўлена не давальняюча, што ў значнай ступені адбілася на іх ролі ў барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

Барацьба за партыйнасьць навукі і мастацтва—важнейшы ўчастак работы камсамолу. Між тым, у гэтым напрамку Менгаркомам ЛКСМБ зроблена вельмі мала. Асабліва слаба праявіў сябе гарком ЛКСМБ у правядзеньні месячніка беларусізацыі.

У той час, калі ў справе вайсковай работы арганізацыя мае значныя колькасныя паказальнікі, якасьць работы вайсковых гурткоў нізкая. Спэцыялізацыя вайсковых ведаў павінна стаць у нарадак дня кожнай камсамольскай ячэйкі.

За апошнія 11 месяцаў камсамольская арганізацыя Менску на аснове шырокай масавай работы вырасла на 8.615 чалавек 98 прод. рабочых і моладзі ахоплена камсамолам. Аднак, па гэтым вучастку работы ёсьць буйнейшыя недахопы. Замаўчваньне росту правадзіцца слаба. Ёсьць выпадкі адліву. Вельмі мала ад'ецца ўвагі якасьці палітвыхаваньня, асабліва навічкоў камсамольцаў.

***

На гэтым-жа пасяджэньні з прамовай аб задачах камсамольскай арганізацыі выступіў сакратар ЦК КП(б)Б тав. Шаранговіч.

Пастанова прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б

па справе старшыні Барысаўскай РКК-РСІ т. Лехарзака

Заслухаўшы паведамленьне члена прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б тав. Аверына аб выніках расьсьледваньня абвінавачаньняў, раданёўленых старшыні Барысаўскай РКК тав. Лехарзака ў артыкулах газэт **«Бальшавік Барысаўшчыны», «Рабочий» і «Акцябр»**—ад 20 лістапада пад загалоўкам «Апартуністычная практыка, заціск самакрытыкі — прычыны адсутнасьці бальшавіцкіх тэмпаў па прамысловых Барысаўшчыны», прэзыдыум ЦКК КП(б)Б канстатуе:

Што адзначаныя газэты, побач з правільным ускрыцьцём апартуністычнай практыкі на Барэзінскім камбінаце і прарыву ў рабоце пазасобных прадпрыемстваў Барысава, пранэрвільна арыентавалі партыйную арганізацыю, прадставіўшы справу такім чынам, што адным з галоўных вінаватых прарыву ў рабоце прадпрыемстваў Барысаўшчыны—зьяўляецца старшыня Барысаўскай РКК тав. Лехарзака.

На зьнімаючы адказнасьці з Барысаўскай РКК-РСІ, у прыватнасьці старшыні РКК тав. Лехарзака, за прарывы, якія ёсьць на пазасобных барысаўскіх прадпрыемствах, — прэзыдыум ЦКК адначасова прызнае, што расьсьледваньнем, праведзеным сумесна з прадстаўніком газэты «Рабочий», абвінавачаньні старшыні РКК тав. Лехарзака ў заціску самакрытыкі, недапушчэньні рабкораў на прадпрыемствы, падтрыманьні, як быццам, апартуністычнага прамфінпляну ПЭС, перэгаваньні на газэтныя заметкі—**не пацьвердзіліся** і зьяўляюцца беспадстаўным абвінавачаньнем, бяз усякай спробы разабрацца ў сапраўднасьці фактаў, чым памянёныя газэты дапусьцілі палітычную памылку.

Адзначаючы вялізарную ролю цэнтральнага, раённага і пізавога друку БССР, як баявога памочніка партыйнай арганізацыі ў барацьбе за генэральную лінію партыі,—прэзыдыум ЦКК КП(б)Б падкрэсьлівае, што гэта адказьнейшая роля абавязвае партыйна-савецкі друк яшчэ больш узмацніць барацьбу з фактамі перахлёстваньня, пагоняй за сэнсацыямі, рашуча павышаючы адказнасьць газэты за зьмешчаны ў ёй матар'ял, памятаючы—«што злачынна з-за пагоні за сэнсацыяй шальмаваць на старонках друку каго-б там ні было... што гэткія прыёмы павінны быць самым рэзкім чынам асуджаны і зусім зьніш-чаны ў практыцы друку» (з пастановы прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б).

Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б прызнае нетастатковым віраўніцтва раённых парторганаў работай газэты «Бальшавік Барысаўшчыны» і рабкораўскім рухам, што прывяло да пэўнага адрыву газэты ад партыйнага кіраўніцтва.

Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б абавязвае партыйныя арганізацыі забясьпечыць сыстэматычнае і глыбокае партыйнае кіраўніцтва друкам і рабселькораўскім рухам «што зьяўляецца адзай з першачарговых задач усёй КП(б)Б» (з пастановы ЦК КП(б)Б).

Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б зва ачае ўвагу райкому КП(б)Б, РКК і ўсёй партарганізацыі Барысаўшчыны на неабходнасьць прыняцьця рашучых мер па ліквідацыі прарываў у рабоце барысаўскіх прадпрыемстваў, на ўзмацненьні барацьбы з канкрэтнымі позьбітамі апартунізму, на забясьпячэньні сапраўднай перабудовы работы прадпрыемстваў па-новаму на падставе поўнага ажыцьцяўленьня 6-ці ўмоў тав. Сталіна, неадпаўжна чаго зьявілася асноўнай прычынай дапушчаных прарываў у рабоце барысаўскіх прадпрыемстваў.

СТАЛОЎКА ЗАВОДУ „ЧЫРВОНЫ МЭТАЛІСТ" СТАЛА ЎЗОРНЫМ ЦЭХАМ ХАРЧАВАНЬНЯ

ВОПЫТ ВІЦЕБСКІХ РАБОЧЫХ—НА УСЕ ПРАДПРЫЕМСТВЫ

У руках добрых арганізатараў

Яшчэ не пасьпеў прарэзьлівы гудок сыгналізаваць аб наступленьні абедзенага перапынку, як людзкі паток заліўшій калідор; доўгая істужка расьцягнулася па заводзкім завулку... Рабочыя заводу «Чырвоны мэталіст» сьпішаліся хутчэй стаць у чаргу за абедам.

Так было... Чарга за абедзенымі талёнамі, чарга за атрыманьнем абедаў, змаганьне за месца ў сталоўцы. А ў цэху, ля варштатаў, ля пыльных наждачных каменьняў групы рабочых даядалі сухую страву. Ялы сьвядома адмаўляліся ад гарачага абеду, абы толькі не стаяць у чарзе.

***

Усё быццам так, як і раней. Тыя-ж людзі, тыя-ж варштаты. Але абставіны зьмяніліся.

У цэхах, ля заводзкіх орам і сталовак вялізныя абвесткі, якія відаюцца ў вочы: «Абгаварэньне ярамовы т. Сталіна на зьезьдзе гаспадарнікаў»; «Новыя абставіны, — новыя задачы гаспадарчага будаўніцтва»; «Шэсьць умоў тав. Сталіна...»

— Мы бярэм на сябе абавязак штодзённа павялічыць выпрацоўку бульбакапалак, палепшыць якасьць, ліквідаваць спазьненьні на работу. Патрабуем ад нашых гаспадарнікаў ліквідацыі ўраўнілаўкі, абязьлічкі і паляпшэньня работы сталоўкі—заявілі рабочыя.

Дагавор заключан. Гаспадарчы разрахунак, зьдзельшчына, барацьба з абязьлічкай — пытаньні, якімі мэталісты займаюцца кожны дзень, кожны гадзіну.

Крывая выкананьня праграмы ўзьнімаецца ўсё вышэй і вышэй. Да Кастрычніцкіх сьвят завод прыйшоў з перамогай. Плян выканан на 103 проц. Вялікія заслугі тут усіх цэхаў, у тым ліку новага — цэху харчаваньня.

***

— Заходзьце, калі ласка, у цэх харчаваньня. Праз 10 мінут абедзены перапынак,—зварачаецца да нас рабочы-ўдарнік Якімаў, вылучаны на пасаду загадчыка сталоўкі. Першае, што відаецца ў вочы, гэта ідэальная чыстата. Чыстыя сталы, кветкі, і графіны з вадой на іх. 240 чалавек абедаюць... Ні шуму, ні штурхатні, ні чаргі.

Абед працягваецца толькі 15 мінут. Нічога лішняга ў гэтым няма. Абедзеныя талёны рабочыя атрымліваюць у сябе ў цэху. Кожны цэх мае сваю пастаянную абедзеную гадзіну. Сталоўка пасьпявае абслужыць штодзённа 1400 чалавек, адпусьціць 60 дыэтычных абедаў. Апрача таго, працуе буфэт, які абслугоўвае ўсе зьмены. Якасьць абедаў зусім здавальняючая. Цэх харчаваньня заключыў дагавары з калгасамі, якія забясьпечваюць сталоўку мясам і інш. прадуктамі. Зараз будуецца сьвінарнік на 200 сьвіней. За апошні час сталоўка дабілася яшчэ аднаго посьпеху—24 дні ў месяц рабочыя атрымліваюць мясныя абеды.

Сталоўка заводу «Чырвоны мэталіст» ператварылася ва ўзорны цэх харчаваньня.

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ.
М. ВЗЛІКСОН.

Будаўнікі Дому ўраду не маюць абсталяванай сталоўкі

Сталоўка на пабудове ДОМУ ЎРАДУ знаходзіцца зусім у дрэнным становішчы. Не хапае інвэнтару, асабліва талерак і лыжак. Прадукты, якія сталоўка атрымлівае з базы МЦГК, нядобраякасныя. Працаўнікі сталовай не забясьпечаны спэцвопраткай. Слаба праводзіцца загатоўкі прадуктаў на зіму, ня гледзячы на тое, што ў сталоўцы ёсьць хавальні.

Дагэтуль работнікі сталоўкі не пераведзены на прагрэсыўную зьдзельшчыну; не вядзецца нават падрыхтоўка да пераводу. Памяшканьне абсталявана; падвойныя вокны ня ўстаўлены, у сталоўцы вельмі холадна. Нездавальняючы санітарны стан сталоўкі: падлога брудная, на кухні шмат прусакоў, начыньне пасьля мыцьця не выціраецца.

Партыйныя, камсамольскія і прафэсыянальныя арганізацыі пабудовы Дому ўраду зусім не цікавяцца работай сталоўкі. Нічога ня робіць і рабочы кантроль.

Б.

Наладзіць харчаваньне студэнцтва

Адзін з самых адсталых вучасткаў грамадзкага харчаваньня — гэта абслугоўваньне студэнцтва.

Сталоўка № 67 зусім не прыстасавана да абслугоўваньня мас студэнцтва. Заля маленькая, няма кладоўкі, замест не карыстаюцца невялікім калідорчыкам, дзе заўсёды холадна, шмат шчылін і дзе псуюцца і мерзнуць прадукты. Кухня сталоўкі — у цесным і брудным сутарэньні. Атынкоўка са столі абвальваецца і кожны дзень можна чакаць, што ў кацёл упадзе кавалак вапны. Дымна, няма вентыляцыі. Санітарная камісія ўжо склала акт на гэту сталоўку.

Другая сталоўка — № 37 прапускае ў дзень каля 2.500 студэнтаў у той час, як максымальная нагрузка — ня больш 1.500.

У калідоры сталоўкі, які знаходзіцца паміж кухняй і абедзенымі залямі, цесна: афіцыянтка ніяк ня можа прайсьці з поўнымі талеркамі праз калідор. Студэнты самі атрымліваюць страву і потым праціскаюцца ў залю, дзе часта прыходзіцца стаяць з талеркамі, чакаючы, пакуль аслабяніцца месца. Перад акном, адкуль адпускаюцца абеды, заўсёды чаргі.

Студэнцкая сталоўка № 69 на мае гарадняхавальні.

Ёсьць поўная магчымасьць разгрузіць студэнцкія сталоўкі і палепшыць харчаваньне. Белкаапхар і Менскі трэст грамадзкага харчаваньня павінны адкінуць больш увагі харчаванню студэнцтва — падпускаць лепшыя памяшканьні пад сталоўкі, забясьпечыць іх устаноўленымі нормамі прадуктаў і г. д.

Г.

Ня здымку: рацыяналізатары Саюзпрамрамхлеба на Менскім Хлебазаводзе. Справа—ударнік заводу т. Бурдзіцкі.пераводу. Памяшканьне не абсталявана.

ІМПЭРЫЯЛІСТЫ РАЗРЫВАЮЦЬ КІТАЙ НА ЧАСТКІ

Праграма няпрыкрытага разбою і грабежніцтва

ДЭТЭРДЫНГ УЗБРОЙВАЕ БЕЛАГВАРДЗЕЙСКІЯ БАНДЫ

АДКРЫТАЯ ДЭКЛЯРАЦЫЯ ЯПОНСКАГА УРАДУ

ТОКІЁ, 15. Новы японскі ўрад Інукайя парашыў у манчжурскім пытаньні прытрымівацца трох асноўных прынцыпаў:

1. Усе нявырашаныя манчжурскія пытаньні павінны быць вырашаны ў сувязі з урэгуляваньнем манчжурскага інцыдэнту.

2. Ня можа быць і гутарні аб звароце ўраду Чжан Сюэ-ляна, адказнага за манчжурскі інцыдэнт.

3. Японія павінна аказаць усялякую садзейнасьць руху за стварэньне новага ўраду ў Манчжурыі.

Канкрэтнае правядзеньне гэтых пытаньняў, як паведамляе газэта, мяркуецца наступным шляхам:

1. Японіі «безразлична» форма кіраваньня ў Манчжурыі, асноўнае заключаецца ва ўдаленьні Чжан Сюэ-ляна.

2. Урэгуляваўшы ўсе манчжурскія пытаньні, Японія павядзе станоўчую палітыку ў Манчжурыі, інвэстуючы (укладваючы) капіталы.

3. Японія акажа ўсялякую дапамогу манчжурскаму ўраду ў падтрыманьні парадку.

4. Японія дазволіць прыцягнуць замежныя капіталы, у тым ліку кітайскія.

5. Наяўнасьць ураду Чжан Сюэ-ляна ў Цзіньчжоу зьяўляецца пагрозай для парадку ў Манчжурыі, і таму Японія прыме рашучыя меры для зьнішчэньня гэтага ўплыву.

***

Першая дэклярацыя японскага ўраду зьяўляецца **адкрытым дакумантам разбою і няпрыкрытага** грабежніцтва. Кожны з пунктаў па сутнасьці прадстаўляе сабой фіціль, які добра распальвае як увесь канфлікт, так і ваенныя дзеньні. Рашуча пярэчачы супроць ураду Чжан Сюэ-ляна, «адказнага за інцыдэнт» (!!), японскі габінэт абяцае «садзейнасьць» новаму ўраду, які складаецца, зразумела, цалкам з японскіх стаўленікаў. «Урэгуляваўшы пытаньне», г. зн. расправіўшыся з працыўнікам ваеннымі мерамі, Японія абязвяваецца весьці палітыку вайны мірнымі сродкамі, г. зн. укладваць капіталы і заманоўваць кабалу да новага чарговага выбуху. У заключэньне новы японскі ўрад абяцае захваціць Цзіньчжоу. Гэта дэклярацыя заяўнічай японскай рэакцыі падмацоўваецца яшчэ асобным выступленьнем японскага ваеннага міністра Араўкі, які настойвае на «рашучай і цьвёрдай палітыцы Японіі ў Манчжурыі» і патрабуе новай насыпкі войск. Рада міністраў згадзілася з патрабаваньнямі Араўкі.

Апошнія падзеі—праграма новага японскага ўраду, захватніцкія пляны французкіх імпэрыялістаў, пазыцыя Злучаных штатаў і Англіі, нарэшце, нават адстаўка Чан Кай-шы сьведчаць аб тым, што Кітай уступае ў паласу буйных палітычных падзей і становіцца зноў аб'ектам крывавай імпэрыялістычнай гульні.

Францускі генштаб—арганізатар антысавецкай інтэрвэнцыі

НЮ-ЁРК. Надзвычайная напружанасьць міжнароднай абстаноўкі вельмі выпукла падкрэсьліваецца выкрыцьцямі амэрыканскага штотыднёвіка «Пэйпэн» аб дзейнасьці антысавецкіх элемэнтаў, сканцэнтраваных у Парыжы.

Гэта дзейнасьць праяўляецца ня толькі ў скамароскіх ваенных агляданах і парадах, якія час ад часу арганізуюцца генэралам Мілерам, кіраўніком белагвардзейскіх шпархістаў на вачох улад гораду Парыжу і ўраду Францыя, і ня толькі ў іспаньні вайсковых школ, дзе царскія генэралы навучаюць белагвардзейскае юнацтва ваеннай справе з «благожелательного» «пяведаньня» тых-жа францускіх улад. **Расійскія белагвардзейцы выконваюць і больш простыя заданьні францускага генэральнага штабу.** Пав дне паведамленьня гэтай часопісі, у сьнежні 1930 г. у Парыжы было арганізавана белагвардзейскае таварыства ваеннага спаражэньня, зацьверджанае францускім вайсковым і гандлёвым міністэрствамі, якое мела сваёй задачай «выраб, куплю і продаж усякага роду ваенных матар'ялаў, вайсковай амуніцыі» і г. д. Заснавальнікам таварыства зьявіўся нямецкі інжынэр Бэкер, які ўпёс у якасьці пайвога ўнёсу свае патэнты на выраб выбуховых матэрый і артылерыйскага рыштунку.

Дырэктарамі таварыства зьяўляюцца **Пуцілаў і Ліанозаў.** Ліанозаў — адзін з дырэктароў дэтэрдынгаўскага нафтавага трэсту «Шел». Сам Дэтэрдынг прымае ня менш актыўны ўдзел у справах расійскіх белагвардзейцаў. Дэтэрдынг, як відома, не адзін раз адмаўляў свой непасрэдны ўдзел у белагвардзейскіх махінацыях супроць СССР.

Амэрыканская часопісь на гэты раз **дакументальна выкрывае** яго. Часопісь паведамляе: «У верасьні 1930 г. Дэтэрдынг выступіў у Сэўры перад сходам расійскіх эмігрантаў і прадстаўнікоў францускага вышэйшага сьвету, сярод якіх былі і выдатныя францускія палітычныя дзеячы. **Дэтэрдынг заклікаў эміграцыю моладзь быць гатовай да выступленьня супроць СССР.**

У доказ сваёй упэўненасьці у падыходзячым хуткім адпраўленьні эмігрантаў на іх бацькаўшчыну, г. зн. у Расію, **Дэтэрдынг заявіў, што «на кожны даляр, сабраны эмігрантамі ў фонд вайсковага снаражэньня арміі інтэрвэнтаў, ён, Дэтэрдынг, дае даляр ад сябе».**

З благаславеньня францускіх улад белагвардзейская эміграцыя арганізавала банк узаемадапамогі, які пачаў функцыянаваць у студзені бягучага году. Адным з дырэктароў банку зьяўляецца Бярвацкі, былы міністар фінансаў ва ўрадах Керанскага і Дзянікіна.

Наступленьне японцаў на поўдзень

ТОКІЁ. Японцы паведамляюць аб дзейнасьці чжан сюэ-лянаўскіх войск. Паводле даных мукдэнскіх улад чжан сюэ-лянаўскія войскі разбурылі нібы чыгунку па вучастку Тунлю-Чжэньцзятунь, якая служыць гарантыяй японскіх апазык. Таму, паведамляецца далей, **у гэты раён накіраваны японскія войскі.** З Чаньчуня ў раён Сыпінгай-Таонапьскай чыгункі і раён Кунчуньліху таксама накіраваны новыя японскія войскі. Наперакор весткам урадавых колаў аб адводзе чжан сюэ-лянаўскіх войск у Паўночны Кітай, мукдэнскія крыніцы цьвердзяць, што «няма ніякіх аднак адводу чжан сюэ-лянаўскіх войск», хоць лічаць, што «становішча Чжан Сюэ-ляна робіцца небясьпечным у сувязі з падрыхтоўкай Хан Фу-чу (старшыня Шаньдунскага правінцыяльнага ўраду) выступіць у карысьць анфуістаў.

Заўвага: Анфу (рэакцыйная кітайская палітычная партыя), будучы на чале ўлады, зьяўлялася энэргічным правадніком японскага ўплыву, спрыяючы ўкараненьню японскага капіталу ў Кітай. Рэзка варожая нацыянальна-рэвалюцыйнаму руху.

Пасылка новых японскіх войск у Манчжурыю

ТОКІЁ, 16. З Мукдэну ўчора адпраўлены авіяцыйныя часьці для ўдзелу ў баёх у раёнах Чжэньцзятуня.

Новае назначэньне Чан Кай-шы

ШАНХАЙ, 16. Адстаўка Чан Кай-шы прынята. У цыркуляры, які будзе пераадкладна апублікован і перададзены па тэлеграфу для ўсеагульнага ведама, указваецца, што гэты крок прыняты ў інтарэсах нацыянальнага міру і аб'яднаньня для таго, каб забясьпечыць аб'яднаны фронт для барацьбы з японскай агрэсіяй у Манчжурыі. Агэнцтва Гомінь паведамляе, што Чан Кай-шы будзе прапанаван пост старшыні рады нацыянальнай абароны. Гэты пост будзе створан на першай аб'яднаній парадзе панкінскага і кантонскага камітэтаў гаміндану, прысьвечаным пытаньню аб рэарганізацыі ўраду і гаміндану. Нарада гэта адбудзецца на будучым тыдні (ТАСС).

***

ШАНХАЙ, 17. У шанхайскіх колах надаюць вялікае значэньне таму факту, што, ня гледзячы на адстаўку, Чан Кай-шы ўсё-ж старшынствуе на надзвычайным пасяджэньні цэнтральнага выканаўчага камітэту гаміндану, а так сама на пасяджэньні цэнтральнай палітычнай рады. Адстаўка Чжан Сюэ-ляна ў якасьці памесьніка камандуючага ўзброенымі сіламі Кітаю прынята. Чжан Сюэ-лян назначан старшынёй «камісіі па захаваньні міру» ў паўночным Кітаі. Адначасова Чжан Сюэ-лян застаецца на чале сваёй армії ў паўночным Кітаі.

Пастанова ЦК УсеКП(б) аб кантрольных лічбах на 1932 год

1. Прапанаваць СНК Саюзу ССР пры канчатковай разскладцы кантрольных лічбаў народнай гаспадаркі на 1932 год выходзіць з неабходнасьці ўсямернага разгортваньня асноўных галін народнай гаспадаркі, перш за ўсё —апалу, мэталюргіі, машынабудаўніцтва, маючы на ўвазе поўнае выкананьне пляну першай пяцігодкі ў чатыры гады, г. зн. да канца 1932 году.

2. У сувязі з гэтым:

а) вызначыць разьмеры капітальных затрат па ўсёй народнай гаспадарцы на 1932 год **у 21 мільярд рублёў** супроць **16.200 мільёнаў** фактычных затрат у 1931 г.;

б) вызначыць разьмеры капітальных затрат па прамысловасьці (сацыялістычны сэктар) на 1932 год **у 10.700 мільёнаў руб.**, супроць **8.200 мільёнаў** рублёў у 1931 годзе;

в) вызначыць разьмеры капітальных затрат па сельскай гаспадарцы (сацыялістычны сэктар) на 1932 год **у 4.350 мільёнаў руб.**, супроць **3.600 мільёнаў руб.** у 1931 годзе;

г) вызначыць разьмеры капітальных затрат на чыгуначным, дарожным і паветраным транспарце на 1932 год **у 3.330 мільёнаў руб.**, супроць **2.720 мільёнаў руб.** у 1931 годзе;

д) вызначыць прырост уздыму прамысловай прадукцыі на 1932 год у **36 проц.** супроць **20-21 проц.** фактычнага прыросту ў 1931 годзе.

ЦК УсеКП(б).

За групавое ўтрыманьне сьвіней

Пытаньні тэхнікі сьвінагадоўлі набываюць зараз першарадное значэньне. Ад рацыянальнай арганізацыі ўтрыманьня сьвіней, асабліва матак, і парасят, залежыць значнае зьмяншэньне страт у сьвінагадоўлі, эканомія на рабочай сіле і зьмяншэньне выдаткаў на будаўніцтва.

Адным з мэтадаў паляпшэньня тэхнікі сьвінагадоўлі зьяўляецца групавое ўтрыманьне сьвінаматак з парасятамі. Праўда, гэты мэтад пакуль што яшчэ не ўкаранены ў нашых саўгасах і зьяўляецца справай вопытных гаспадараж.

Таму вопыт групавога ўтрыманьня сьвіней у сьвіна-саўгасе **«Лудчыца»** набывае асаблівае значэньне.

Вось што расказвае аб гэтым вопыце ў сваёй карэспандэнцыі зоатэхнік саўгасу тав. **Ціхаміраў.**

— Першыя крокі па арганізацыі групавога ўтрыманьня матак з парасятамі намі былі зроблены яшчэ вясной, у часе выгану сьвіней на пашу. Пачалі мы з таго, што злучылі ў выгулы 3 маткі, у якіх было 20 парасят ва ўзросьце ад 3 да 5 дзён. Першы дзень маткі трымалі сябе вельмі неспакойна, грызьліся і г. д. Але на другі і трэці дзень маткі супакоіліся і жылі даволі дружна. Праз некаторы час маткі перасталі пазнаваць сваіх парасят, а парасяты матак. Саскі абязьлічыліся. Пасьля гэтага мы злучылі яшчэ трох, двух, чатырох і пяць матак (усяго 17 матак), якія мелі 126 парасят.

У сярэднім у адным стаўку трымалася ад 3 да 5 матак.

Рэзультаты атрымаліся дасканалыя. Усе парасяты разьвіваліся нармальна, мелі добры рост і вагу, дзякуючы таму, што, калі яны не нядзаліся ў адной матцы, то пераходзілі да другой.

Пры групавым утрыманьні разьвіцьцё парасят значна лепшае, чым пры індывідуальным. — Парасяты ва ўзросьце аднаго месяца павялічваліся ў вазе ад 4,5 да 6 клгр. у сярэднім. Былі нават выпадкі, калі парасяты павялічваліся ў вазе па 8-8,5 клгр. што бывае даволі рэдка ва ўмовах Беларусі.

Зусім спыніліся такія захворваньні сярод парасят, як белы панос і паратыфус. Няма парасят слабых і заморышаў. Рэзка зьніжуўся процант падзяжу. **З народжаных 352 парасят за два месяцы загінула 15, што складае 4,2 проц.** Трэба дадаць, што за гэты час адчуваўся недахват у кармох.

Нарэшце, плошча, патрэбная для сьвінаматкі, зьмяншаецца ў тры разы, што дае эканомію ў сьвінамясцох. Зьмяншаецца таксама і колькасьць рабочых, патрэбных для догляду сьвінаматак і парасят.

Пры пераводзе на групавое ўтрыманьне трэба памятаць наступнае: лепш за ўсё злучаць матак у адно месца за 10 дзён да апаросу, падабраўшы тых, якія павінны парасіцца адначасова (розьніца дапускаецца ў 3-4 дні). Калі гэта зроблена, дык трэба злучаць матак праз 2-3 дні пасьля апаросу, каб даць парасятам умацавацца. Матак трэба падбіраць з такім разьлікам, каб на кожную прыпадала ў сярэднім па 7-8 парасят.

Да трохтыднёвага ўзросту лепш злучаць у групы па 5-8 матак. Пасьля трохтыднёвага ўзросту парасят можна ставіць у адно месца да 25 матак. Усе парасяты аднаго ўзросту падкармліваюцца ў агульнай сталоўцы, дзе павінна быць выстарчальная колькасьць кармушак і корму.

Парасяты хутка прывыкаюць да сваёй сталоўкі і накіроўваюцца туды па меры патрэбнасьці.

Становішча вынікі групавога ўтрыманьня матак з парасятамі ў саўгасе «Лудчыца» гаворыць аб неабходнасьці хутчэйшага ўкараненьня гэтага мерапрыемства ў практыку ўсіх сьвінасаўгасаў БССР.

Зоатэхнік **С. ЦІХАМІРАЎ.**

АД РЭДАКЦЫІ: Рэдакцыя «Зьвязды» просіць сьвінагадоўчы інстытут і спэцыялістаў у галіне сьвінагадоўлі выказаць свае меркаваньні наконт вопыту ў сайгасе «Лудчыца» і распаўсюджаньне яго на іншыя сьвінасаўгасы БССР.

Індыя у агні

Вялізарная сялянская Індыя з насельніцтвам у 350 мін. калёніяльных рабоў ангельскага імпэрыялізму стаіць, бязумоўна, напярэдадні буйных рэвалюцыйных падзей, накіраваных супроць імпэрыялізму, памешчыкаў-фэадалаў і буржуазіі. Бязьлітасная эксплёатацыя, вялізарныя падаткі, голад, эпідэмія—вось вышкі панаваньня ў Індыі на працягу паўтара стагодзьдзя ангельскага імпэрыялізму. Найбольшы ўзрост інтэнсіўнасьці—**25 год.** Старых у Індыі амаль зусім няма. Большасьць насельніцтва Індыі памірае у дзіцячым узросьце ад голаду. Сярэдні бюджэт індыйскага селяніна—**30 руб. у год.** 40 млн. вясковага насельніцтва кагул ня мае ніякай гаспадаркі, вандруючы па краіне і жабруючы ці перабіваючыся выпадковай работай, якую цэпер, у сувязі з нячуваным гаспадарчым крызысам, амаль зусім немагчыма знайсьці.

У гэты-ж час тысячы індыйскіх памешчыкаў і раджэй жывуць у балучнай уседнай раскошы, маючы пры сабе рабоў, якіх яны могуць прадаваць, аддаваць адзін другому і абменьваць, ня гледзячы на тое, што рабства фармальна ў Індыі скасавана. Нідзе няма такой паказной раскошы, як у Індыі, у гэтай багацейшай і ўраджайнай краіне. Але нідзе ў сьвеце не знайсьці таксама і такой масавай галечы, голаду і страшэннага прыгнёту. **Селянін у Індыі,** як правіла, **не ўладае зямлёй,** якую ён апрацоўвае. Ён ле арэндуе ў памешчыка-зямляўласьніка ці ў ліхвяра, якому ён даўно ўжо залажыў і пераздалажыў усю сваю маемасьць і працуе на яго фактычна, як яго батрак ці раб. Адны толькі процанты па даўгох сялянства памешчыкам і ліхвяром складаюць суму, якая **перавышае кошт падвойнага ўраджаю ўсёй Індыі.** Чым далей, тым больш і глыбей закабальваюцца селяніны. Сусьветны эканамічны крызіс за апошнія два гады стварыў для індыйскага сялянства зусім жахлівыя ўмовы існаваньня. Крызіс паніжэньня цэны на прадукты сельскай гаспадаркі ў два-тры разы. Між тым падаткі ня прыгнёт застаўся ранейшым, а процанты на даўгох узрасьлі. Калі індыйскі селянін галадаў раней, дык зараз, калі падатковая ўлада, памешчыкі-ўласьнікі і ліхвяры патрабуюць з яго па-ранейшаму ўсё тыя-ж самыя падаткі (ўлада пастанавіла нават павысіць цэнер падаткі, каб узмацніць прыцёк грошай з Індыі ў Англію), тую-ж арэндную плату за зямлю і процанты па даўгох,—індыйскаму селянству застаецца толькі адзін выхад: паўстаць са зброяй у руках, скінуць уладу імпэрыялізму ў Індыі, зьнішчыць усіх чужаедаў, захапіць і падзяліць зямлю, ліквідаваць усіх сваіх эксплёататараў-памешчыкаў і ліхвяроў, якія раскошна жывуць пад праменямі брытанскай кароны. Інакш голад і сьмерць.

Аграрная рэвалюцыя ў Індыі набліжаецца сьмімільнымі крокамі. Яна ўжо фактычна пачалася ў Бірме. Там ужо больш году ідзе жорсткая партызанская барацьба паміж войскам і селянамі, якія ўціклі з вёсак ад прыгнёту ўлады памешчыкаў і ліхвяроў.

Злучаныя правінцыі Індыі прадстаўляюць сабою другую вобласьць Індыі, дзе ня сёньня-заўтра выбухне такая-ж барацьба. Індыйскія газэты яшчэ ўлетку бягучага году пісалі, што ў Злучаных Правінцыях, якія найбольш моцна захоплены крызісам і голадам, паліцэйскія і падатковыя чыноўнікі, з таксама агенты зямляўласьнікаў могуць зьяўляцца ў вёсках толькі ўдзень і толькі з добра ўзброенай вартай. А Злучаныя Правінцыі зьяўляюцца важнейшай вобласьцю, сэрцам с.-г. Індыі. Яны знаходзяцца ў сярэдняй плыні Ганга, уздоўж даліна якога корміць кала паловы ўсяго насельніцтва Індыі. У Злучаных Правінцыях жыве звыш 50 млн. чал. і паўстаньне сялянства ў гэтай частцы Індыі будзе азначаць пачатак сялянскага паўстаньня ва ўсёй Індыі. Таму тым большую цікавасьць прадстаўляюць дарожныя нарысы вачыведца, які ў кастрычніку бягучага году пабываў у некалькіх галадаючых вёсках Злучанай Правінцыі. Вось што піша гэты вачыведца.

***

У Злучаных Правінцыях ёсьць два роды вёсак. Адны вёскі заміндарскія (памешчыцкія), а другія, так званыя, зьмешаныя. У зьмешаных вёсках зямля належыць дробным зямлятрымальнікам, а ў заміндарскіх—уся вёска належыць заміндару (памешчыку). Гэта значыць, што ўся зямля, уключаючы таксама і сядзібу і сялянскія двары, належаць заміндару. Заміндар плаціць ураду зямельны падатак, зьбірае грошы для гэтай мэты са сваіх сялян. Зразумела, ён з сялян зьбірае больш грошай, чым сам плаціць урадавым падатковым чыноўнікам.

Я парашыў паехаць не ў заміндарскую вёску, а ў такую, дзе сяляне самі плацяць непасрэдна ўрадавым органам зямельны падатак. У гэтым годзе гэта вёска, якая знаходзіцца ад Алахабаду (сталіца Злучаных Правінцый) усяго за некалькі кілёмэтраў, не заплаціла ні падатку, ні пядоімак за мінулыя гады. У сялян няма грошай. У іх няма нават ежы на кожны дзень. Два тыдні таму назад падатковыя чыноўнікі ў суправаджэньні атраду паліцыі адправіліся ў гэту вёску, каб спагнаць падаткі сілай. Паліцыя абшукала ўсе дамы, але змагла канфіскаваць толькі тры дзіцячыя калыскі, некалькі прадметаў хатніх рэчаў і крыху адзеньня. Падатковыя чыноўнікі прабавалі канфіскаваньня рэчы прадаць у самой вёсцы, але ніхто ніхто на аўкцыёне не знайшоўся. Я бачыў гэта жабрацкае дабро. Яно так і засталося ляжаць у вясковым паліцэйскім пункце. З прычыны таго, што вёска гэта знаходзіцца каля самога Алахабада, не зьяўляецца заміндарскай, дык улада махнула на яе рукой. У іншых выпадках справа разгортваецца па-другому. Але і тут становішча сялянства надзвычай няжкае і зусім бясспраўнае. Сяляне ўвесь час жывуць у страху перад новым налётам падатковых улад і паліцыі. Некалькі раней у гэтай вёсцы паліцыя зьбіла на пляцы аднаго хлопчыка, які адважыўся выказаць сваё абурэньне паліцэйскаму афіцэру з прычыны сацыяльнай пяроўпасьці. Між іншым, сяляне многае не дагаворваюць таму, што яны баяцца ў кожным новым чалавеку спаткаць паліцэйскага шпіёна.

Абурэньне шырокіх працоўных мас сялянства супроць ангельскага імпэрыялізму расьце. Аграрная рэвалюцыя ў Індыі набліжаецца сьмімільнымі крокамі.

Р.

Укараніць санмінімум, палепшыць бытавыя ўмовы рабочых

Саўгас **«Велень»**, Пухавіцкага раёну, зьяўляецца буйнейшай фабрыкай мяса ў БССР. Паводле пляну, да канца гэтага году ў саўгасе павінна было быць сканцэнтравана 1700 сьвінаматак. Але плян камплектаваньня стада саўгасу сарваны. Зараз у саўгасе ёсьць 750 сьвінаматак.

Галоўнай прычынай прарываў у галіне камплектаваньня зьяўляецца дрэнны догляд сьвіней, асабліва малад няка, сярод якога распаўсюджан белы панос. Маладняк не атрымлівае мінеральнай падкормкі. У выніку—значны адыход маладняка.

У сьвінарніках няма падсьцілу. Кіраўніцтва саўгасу чакае, пакуль прыпяюць падсьціл... з цэнтру. Між тым тыдзень таму назад можна было яшчэ накасіць досыць травы на балоце і скарыстаць яе для падсьцілу, але дырэкцыя саўгасу аб гэтым мала клапацілася.

У сьвінарніках усё яшчэ панує абязьлічка, зьдзелычына ня стала зброяй для ўзьвышэньня прадукцыйнасьці працы і паляпшэньня якасьці догляду жывёлы. У саўгасе нагляда́ецца вялікая цякучасьць рабочай сілы, што дзенна прыходзяць і ўходзяць рабочыя.

Гэта выклікаецца дрэннымі культурна-бытавымі ўмовамі рабочых. Баракі, якіх ёсьць досыць, знаходзяцца ў антысанітарным становішчы, там заўсёды бруд, дым, холад. Сталоўка пераведзена ў новае памяшканьне, але там таксама бруд, чаргі, цемра, бяцам з-за адсутнасьці лямпы. Усё гэта адштурхоўвае рабочых.

Дырэкцыя саўгасу і грамадзкія арганізацыі—парт'ячэйка і рабачком нічога не зрабілі для паляпшэньня культурна - бытавых умоў рабочых, ня гледзячы на наяўнасьць усіх магчымасьцяй для гэтага.

Шэсьць умоў тав. Сталіна не скарыстаны дырэкцыяй і грамадзкімі арганізацыямі для ліквідацыі прарываў у саўгасе.

Гэтымі днямі ў саўгас прыбыла брыгада рабочых новай фабрыкі «Кастрычнік». Быў скліканы экстраны зьлёт ударнікаў саўгасу, на якім было пастаўлена пытаньне аб перавыбарах парт'ячэйкі і аб уключэньні ў праверку, абвешчаную «Правдой» па рэалізацыі шасьці ўмоў тав. Сталіна. Арганізаваны пераварчыя брыгады з лепшых ударнікаў і саўгаснага актыву.

У саўгасе абвешчан пяцідзеньнік укараненьня санітарнага мінімуму і паляпшэньня культурна - бытавых умоў рабочых. Прыступлена да радыёфікацыі баракаў.

Брыгада рабочых фабрыкі «Кастрычнік»:

Разгнаў, Пікус, Мзеровіч, Баркан.

Паведамленьні

— **Дэкаднія Камакадэміі.** Сёньня, 18 сьнежня, роўна ў 7 гадз. адбудзецца даклад т. Э. Кольмана на тэму: «Становішча і задачы фронту прыродазнаўства».

— Сёньня, 18 сьнежня 1931 г., у 8 з пал. гадз. веч., у галоўным корпусе БДУ 3-ці паверх, 317 аўд.), адбудзецца адкрыты партыйны сход плянава-эканамічнага інстытуту на пытаньні абгаварэньня ліста т. Сталіна ў часопісь «Пролетарская Революция» і чарговыя задачы інстытуту. Запрашаюцца студэнцтва і навуковыя працаўнікі.

— 20 сьнежня г.г. склікаецца ўсебеларуская нарада па пытаньні аб становішчы кіраўніцтва раёнамі з боку цэнтральных устаноў. Адкрыцьцё нарады адбудзецца 20 сьнежня, у 10 гадз. раніцы, у залі пасяджэньняў ЦВК. Удзель яікі нарады павінны мець пры сабе ўсе неабходныя матар'ялы па пытаньні становішча кіраўніцтва раёнамі. У сувязі з асаблівай важнасьці пастаўленых на вырашэньне нарады пытаньняў, просьба забясьпечыць сваячасовую яўку і актыўны ўдзел у рабоце нарады.

— **Менгарком КП(б)Б, Гарпрафсавет і радыё-газэта «За бальшавіцкія тэмпы»** 20 сьнежня, у 9 гадз. веч., арганізуюць **радыё-мітынг аб становішчы ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці.** Ля мікрафону выступяць: зав. «Бальшавік», «Полымя Рэвалюцыі», ф-ка «Кастрычнік», ф-ка імя Крупскай, гута «Пролетары», Дом Ураду і інш. Трэба забясьпечыць калектыўнае слуханьне і прыцягнуць да рэпрадуктараў прадстаўнікоў грамадзкасьці, усіх няпісьменных і малапісьменных.

Адказны рэдактар М ГАРЫН

МЕНСКІ ГАРАДЗКІ ТЭАТР

Сёньня, 18-га сьнежня г. г.,

адбудзецца

ЎРАЧЫСТЫ ВЕЧАР,

прысьвечаны 10-гадовай літаратурнай дзейнасьці пралетарскага паэта

АНДРЗЯ АЛЕСАНДРОВІЧА.

Пачатак у 6 гадзін.

Уваход па запрашальных білетах. Білеты можна атрымаць у Доме Пісьменьніка і ванцылярыі тэатру.

Кіно **„Пралетары"**

З 18 сьнежня

ЭМА ЦЗСАРСКАЯ

ў МАСТАЦКІМ ФІЛЬМІ

2 МАТКІ 2

Драма ў 6 частках.

Звыш праграмы хроніка Саюзкіно

Пачатак дзенных сэансаў у 2 г. і 3-30, вячэрніх—у 6, 7-30, 9, 10-30.

Каса адкрыта з 12 гадз. дня

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". Пач.: 6, 7-30, 9 і 10-30. — Гуканы гаварашчы фільм **ШТОРМ** гукавы фільм „ПАСІФІК".

„Культура" Пач.: 7, 8-45, 10-30 — Маставкі усходні фільм **АНУШ** Звыш праграмы: **Подарам нанец**

Інтэрнацыянал Адкр. з 12 г. дня. — **ЭЛЕН РЫХТЭР** у камедыі **МАРАЛЬ.** Звыш прагр. кіно-хроніка Саюзкіно

„Юны Піянэр" (будынак кіно „Культура") — Мастацкі фільм **СЫГНАЛ** у 7 част. Звыш прагр.—хроніка. Пач. 1 г., 2-30. Каса—ад 11 г. дня.

„СПАРТАК" Пач. 7, 9 і 11 Каса—ад 5 гадз. — Сёньня вядомы фільм **„Коллежский регистратор"** У гал. ролі вядомы артыст **Масквін.**

БЕЛЖЫЛСАЮЗ

перайшоў на шасьцідзенны перапынны тыдзень з устанаўленьнем адзінага выходнага дня кожнага **6, 12, 18, 24 і 30.**

У выходны дні ўстаноўлены дзяжурствы адказных працаўнікоў БЖС.

Пры Рагачоўскім камбінаце наапэрацыйнай асьветы БЕЛНАДАДОЛЮЗУ з 1-га студзеня 1932 г. адкрываюцца **6-месячныя КУРСЫ** па падрыхтоўцы рахункаводаў і пам. бухгальтароў для райсаюзаў спажывецкіх таварыстваў. Курсы разьлічаны на 2 групы па 35 асоб для кожнай групы. У групу пам. бухгальтароў прымаюцца з асьветай на нізкай 6-ці груп 7-годні. І забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй ад 45-55 руб. у месяц (кошт харчаваньня—18 руб.). У групу рахункаводаў прымаюцца з асьветай на нізкай 4-5 груп 7-годні і забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй ад 40-45 руб. у месяц (кошт харчаваньня—18 руб. у месяц). У першую чаргу будуць прымацца рабочыя, калгасьнікі, беднякі, сераднякі, служачыя і дзеці працоўнай інтэлігэнцыі. Курсанты забясьпечваюцца экрачна стыпэндыі навучальнымі прыладамі і падручнікамі за кошт камбінату. Узрост паступаючых ад 18 год. Для залічэньня неабходна прадставіць у камбінат г. Рагачоў. Цымяняўская, 15 (школа і курс. база) наступныя дакументы: пасьведчаньне аб адукацыі (арыгінал, аб сак. і матар'яльным становішчы, аб стане здароўя і нятрымны выпіс, якія прыкладваюцца да заявы аб залічэньні. Заявы прымаюцца да 25-XII—31 г.

Дырэкцыя камбінату.

ПРАВІЛА

прыёму на курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ саюзу рабочых МТС і батрацтва

ЦП саюзу рабочых МТС і батрацтва паведамляе, што з 1-га студзеня 1932 г. пры Водна-Мэліярацыйным інстытуце ў Горках адкрываюцца курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ.

Курсы арганізуюцца ў складзе 2-х груп па 50 чал. у кожнай групе з працягам работы адной групы ў 5 месяцаў, і другой групы—8 месяцаў.

На курсы прымаюцца: рабочыя МТС і МТМ, батракі і рабочыя аэтапаў прадпрыемстваў, абслугоўваемых саюзам рабочых МТС і батрацтва, у першую чаргу рабочыя-ударнікі.

Узрост паступаючых на курсы павінен быць ад 17 да 34 год уключна, вытворчы стаж ня менш 3-х год і прафстаж ня менш аднаго году.

УВАГА: 1. На курсы могуць быць прыняты батракі і ня члены саюзу—члены калгасаў, а таксама батракі працуючыя на найму ў індывідуальным сэктары.

2. Былыя батракі і рабочыя раней працаваўшыя ў сыстэме абслугоўваньня саюзу рабочых МТС і батрацтва, якія зараз выбылі ў другія саюзы ў зьвязку з пераходам на другую работу (выдучэньне, вярбоўка ў прамысловасьць, саўгасы і г. д.), пры ўмове пераходу на другую работу ня менш 2-х гадоў таму назад.

Па адукацыі на курсы прымаюцца:

а) На 5-дзесяцімесячныя падрыхтоўчыя курсы: скончыўшыя самігодку, скончыўшыя 6-ю і шостую групы самігодак, або маючыя агульную адукацыю ў гэтым аб'ёме.

б) На 8-мімесячныя курсы: скончыўшыя 4-годку, або маючыя агульную адукацыю ў гэтым аб'ёме.

З камандыруемых на курсы павінна быць ня менш 40 проц. жанчын.

Курсанты забясьпечваюцца стыпэндыяй у разьмеры 50 руб. у месяц і кватэрай (пры ўмове непрадастаўленьня кватэры курсамі выплачваюцца кватэрныя).

Жадаючыя паступіць на курсы павінны не пазьней 25 сьнежня 1931 г. прадставіць дакументы непасрэдна на адрасе: Горкі, БССР, Водна-Мэліяраціўны інстытут, курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ саюзу рабочых МТС і батрацтва.

Паступаючыя на курсы павінны прадставіць наступныя дакументы: заяву аб прыёме на курсы, запоўненую анкету для паступаючых у ВНУ, заперапую рабачкомам саюзу рабочых МТС і батрацтва, даведку аб саюзе, аб адукацыі, аб становішчы здароўя, аб вытворчым стажы, аб сацыяльным становішчы бацькоў, аб карыстаньні бацькамі паступаючага і самога паступаючага выбарчымі правамі і выпіску з пастановы рабачкому саюзу рабочых МТС і батрацтва аб камандыраваньні на курсы.

Скончаўшыя курсы будуць накіраваны на вучэбу выключна ў Водна-Мэліяраціўны інстытут.

Для разбору заяў пры курсах стварэецца камісія ў складзе:

1. прадстаўніка ЦП (старшыня камісіі), 2. Заг. курсамі, 3. Прадстаўніка ад навучальнай часьці інстытуту. 4. Па аднаму прадстаўніку ад партыйнай і камсамольскай арганізацый інстытуту, 5. Два рабочых-ударнікі ад рабачкому Горацкай МТС.

Аб прыёме на курсы паведамляюць кожнага ў паасобку самі курсы.

Пачатак заняткаў на курсах 1-га студзеня 1932 году.

ЦЭНТРАЛЬНАЕ ПРАЎЛЕНЬНЕ САЮЗУ РАБОЧЫХ МТС І БАТРАЦТВА.

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ

Паступіў у продаж

НАСТОЛЬНЫ ПЕРАКІДНЫ **КАЛЯНДАР** на 1932 год

Тыраж 10.000. Цана 65 кап.

Прадаецца ва ўсіх кнігарнях ДВБ.

Сэктар Кнігагандлю ДВБ.

Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі

ВЕДЗЯ ЗАПІС НА **НАБОР СЛУХАЧОЎ** у колькасьці 25 асоб **на 2-хмесячныя КУРСЫ** падрыхтоўкі кніжных работнікаў для разьніцы кнігарань.

Прымаюцца асобы, якія скончылі 5-ты круп сьмігодкі.

Курсанты забясьпечваюцца стыпэндыяй у 50 руб. у мес. інтэрнатам і сталоўкай.

Заявы з дакумантамі (аб сацыяльным становішчы, узросьце, адукацыі, адносінах да вайсковай службы і здароўі) накіроўваць па адрасе: Менск. Са вешная, 59. Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ да 25-га сьнежня 1931 г.

ДВБ.

Адміністрацыя, ячэйка КП(б)Б і мясцком Наркамснабу БССР з вялікім жалем паведамляюць аб заўчаснай сьмерці старога члена КП(б)Б, чырвонага партызана, супрацоўніка і старшыні мясцкому Наркамснабу

тав. ПРЭАБРАЖЭНСКАГА Сяргея Міхалаевіча.

Пахаваньне адбудзецца 18-га сьнежня ў 1 гадз. дня з памяшканьня Наркамснабу БССР (плац Волі, 7, 3-ці паверх).

Даводзіцца да ведама ўсіх чырвоных партызан і чырвонагвардзейцаў аб дачаснай сьмерці заслужанага чырвонага партызана, члена КП(б)Б, работні